This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2019.pp.263-318

Przegląd Środkowo-Wschodni, 4, 2019
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20190411

Data przesłania: 23.02.2018
Data akceptacji: 23.05.2018

**Віктар Корбут**
Uniwersytet Warszawski
v.korbut@uw.edu.pl
ORCiD: 0000-0001-6848-1160

# Менск 23 чэрвеня 1941 – 23 ліпеня 1944 года

**Mińsk w dniach 23 czerwca 1941 – 23 lipca 1944 roku**

Artykuł jest próbą usystematyzowania wiedzy na temat zabudowy Mińska związanej z okresem pomiędzy pierwszym a ostatnim niemieckim bombardowaniem miasta (23 czerwca 1941 – 23 lipca 1944 roku). Publikacja zawiera listę budynków, które przetrwały do dziś (w porządku alfabetycznym według dzisiejszych adresów). W artykule przedstawiono również historię poszczególnych obiektów przed 1941 i po 1944 roku.

Słowa kluczowe: Mińsk, architektura, II wojna światowa, okupacja

Юры Туронак апрацаваў вялікую колькасць матэрыялаў, прысвечаных грамадска-палітычнаму жыццю Менска ў 1941–1944 гадах, калі горад быў акупіраваны немцамі. Як і многія іншыя даследчыкі гэтага перыяду, Ю. Туронак канцэнтруе ўвагу перш за ўсё на апісанні гістарычных падзей і лёсаў іх удзельнікаў.

Важным дапаўненнем да даследаванняў гэтага перыяду былі б звесткі пра адрасы, будынкі, звязаныя з дзейнасцю асоб і арганізацый. Складанне такога даведніка дазволіла б лепш уявіць жыццё Менска перыяду акупацыі. Асабліва гэта важна ў кантэксце значных горадабудаўнічых змен, якія адбыліся пасля 1944 года. Трасіроўкі вуліц, многія будынкі не захаваліся. Будучым даследчыкам будзе ўсё больш складана супастаўляць сучасныя ім гарадскія

рэаліі з падзеямі 1941–1944 гадоў. Таксама ў гарадскім асяроддзі ўвекавечаны далёка не ўсе падзеі, звязаныя з антынямецкім падполлем. Зусім не адзначаны мемарыяльнымі дошкамі грамадскія будынкі, звязаныя з дзейнасцю прадстаўнікоў беларускай культуры, жылыя дамы, жыхары якіх загінулі ў выніку бамбардзіровак 1941–1944 гадоў.

У 1918 годзе Менск быў абвешчаны сталіцай Беларускай Народнай Рэспублікі. У 1919 і 1920 гадах у горадзе двойчы абвяшчалася Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі, адміністрацыйным цэнтрам якой, са зmененай назвай – Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, Менск (Мінск) з'яўляўся да 28 чэрвеня 1941 года, калі быў заняты нямецкімі войскамі.

14 кастрычніка 1939 года члены Бюро ЦК КП(б)Б слухалі пытанне «О столице Белорусской ССР». Пратакол, падпісаны Першым сакратаром ЦК КП(б)Б П. Панамарэнкам, зафіксаваў рашэнне: «Просить ЦК ВКП(б) пересмотреть решение от 19. IV.–1938 г. о переводе столицы из г. Минска в г. Могилев, оставив столицей БССР г. Минск»[1]. Просьба была здаволена.

29 ліпеня 1939 года на 2-й сесіі Вярхоўнага Савета БССР было прынята рашэнне аб новай назве сталіцы рэспублікі – *Мінск*: замест формы Менск, якая функцыянавала ў афіцыйным ужытку ў ССРБ (БССР) з 1919 года. У перыяд нямецкай акупацыі Мінск называўся ў беларускамоўным друку і афіцыйным беларускамоўным справаводстве акупацыйнай адміністрацыі *Менскам*.

«У адпаведнасці з генеральным планам рэканструкцыі, разлічаным на бліжэйшыя 10–15 год», у Мінску ў першай палове 1941 года вялося інтэнсіўнае ўзвядзенне новых будынкаў і рэканструкцыя старых[2]. Разбудова сталіцы БССР была спынена разам з пачаткам 22 чэрвеня ваенных дзеянняў Германіі супраць СССР.

[1] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні. Гісторыя Беларусі ў журналісцкіх нататках*, Мінск 2016, с. 200.

[2] Д. Ескевіч, О. Батоева, *Рэканструкцыя сталіцы Беларусі,* «Работніца і калгасніца Беларусі» 1941, № 10, с. 8–9.

23 чэрвеня на Мінск упалі першыя нямецкія бомбы: каля шашы ў раёне Уручча, дзе стаяла 100-я ордэна Леніна стралковая дывізія, на Таварную станцыю і Лошыцкі аэрадром. У другой палове 23 чэрвеня Першы сакратар ЦК КП(б)Б П. Панамарэнка прыняў рашэнне аб эвакуацыі дзяцей, каштоўнасцей дзяржаўнага банка, абсталявання і калектыву авіязавода. З раніцы 24 чэрвеня Мінск стаў аб'ектам масіраваных налётаў нямецкай авіяцыі. Уначы 24/25 чэрвеня прадстаўнікі цэнтральных органаў улады выехалі ў Магілёў. Першыя нямецкія дэсантныя групы з'явіліся на вуліцах горада ўжо 27 чэрвеня. Нямецкія рэгулярныя войскі ўвайшлі ў сталіцу БССР у другой палове 28 чэрвеня[3].

Паводле аналізу аэрафотаздымкаў чэрвеня 1941 года, праведзенага П. Растоўцавым, увечары 24 чэрвеня яшчэ былі цэлыя кварталы ў цэнтры горада, напрыклад, былая гасцініца «Парыж» на рагу вул. Савецкай і Энгельса, якая была разбурана падчас аднаго з наступных налётаў. Таксама яшчэ не відаць слядоў пажару на былой гасцініцы «Еўропа», а гэта значыць, што яна была разбурана не 24 чэрвеня[4], як звычайна сцвярджаецца. 24 чэрвеня ад бамбардзіравання асабліва пацярпелі вул. Савецкая (цяпер пр. Незалежнасці), Валадарскага, Урыцкага (Гарадскі Вал), Камсамольская, Ленінская (Леніна), Чырвонаармейская, Свярдлоўская (Свярдлова), Даўгабродская (Казлова), Правіянцкая (Захарава), Пралетарская (Янкі Купалы), Камуністычная (не існуе, праходзіла праз сучасную пл. Кастрычніцкую ад вул. Леніна да Янкі Купалы). Захаваліся цалкам вул. Карла Маркса, Ленінградская[5].

---

[3] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні..*, с. 299–300.

[4] П. Ростовцев, *Использование немецких аэрофотоснимков Минска в изучении характера разрушений города в 1941–1944 гг.* [у:] *Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі. Крыніцы па гісторыі горада. Сацыяльныя структуры і паўсядзённасць: да 945-годдзя Мінска: зборнік навуковых артыкулаў*, уклад. А. Груша, рэдкал.: А. Каваленя і інш., Мінск 2012, с. 476.

[5] И. Воронкова, *Минск: лето 1941, лето 1944,* Минск 2014, с. 169, 171.

Перад уваходам у Мінск немцы паставілі мэту парушыць усе камунікацыі ў цэнтры горада. Выйшлі са строю водаправод, іншыя камунальныя сістэмы. Не было як гасіць пажары. Агонь пайшоў гуляць па горадзе. Акупанты не чапалі толькі заводскія кварталы і драўляныя ўскраіны, а таксама Дом Урада, Дом Чырвонай Арміі, турму на сучаснай вул. Валадарскага, 2[6].

Раніцай 26 чэрвеня яшчэ былі цэлыя кварталы паміж пл. Свабоды і пл. 8 Сакавіка, але ўжо к пачатку ліпеня ад дамоў заставаліся толькі каробкі[7]. На аэрафотаздымку ліпеня 1941 года відаць, што забудова Замчышча на захад ад вул. Стара-Мясніцкай захавалася (раён на захад ад сучаснага пр. Пераможцаў). У той жа час значна пацярпела ўсходняя частка Замкавай гары (бліжэй да Свіслачы)[8]. Паводле П. Растоўцава, дамы ў перыметры вул. Новамясніцкай – Падзамкавай улетку 1941 года ацалелі, але к верасню 1942-га ад іх засталіся толькі каробкі, што, магчыма, звязана з налётамі савецкай авіяцыі або таксама пагромамі ў яўрэйскім гета, у склад якога ўваходзіў гэты раён[9]. На аэрафотаздымку 28 мая 1944 года відаць, што на той час з Замчышча ўжо быў прыбраны друз[10].

Немцы ў студзені 1942 года падлічылі, што жылы фонд горада быў разбураны на 65%[11].

Савецкая авіяцыя бамбардзіравала Менск са студзеня 1942 года, пераважна вайсковыя аб’екты: казармы, аэрадромы, чыгуначны вакзал. Уначы 25/26 сакавіка 1942 года ад бомб, прызначаных для Дома Урада, дзе размяшчалася шмат нямецкіх устаноў, моцна па-

[6] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні…*, с. 300.

[7] П. Ростовцев, *op. cit.*, с. 476.

[8] *Ibidem*, с. 477, 486.

[9] *Вы должны это знать: как создавали и кто разрушал Немигу, которая могла быть нашей «маленькой Вильней». 90 лет Старой Немиги* [online], https://citydog.by/post/minsk1067_nemiga/ [доступ: 21.01.2018].

[10] П. Ростовцев, *op. cit.*, с. 478.

[11] И. Воронкова, *Минск и минчане в 1941 г. (по материалам фондов Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны)* [у:] *Мінск і мінчане…*, с. 451.

цярпела вул. Берсана[12]. С. Станюта ўспамінала: «...Снежань сорак першага, мы з тэатрам ужо з паўгода ў Сібіры, вы [Аляксандр – сын С. Станюты. – *В. К.*] тут, у Мінску, акупацыя... [...] І ацалелі ўсе. А мой тата са сваёй сям'ёй – як іх хата выстаяла насупраць Дома ўрада, зараз якраз пасярэдзіне плошчы Незалежнасці? У гэты ж дом нашы [савецкія. – *В. К.*] самалёты, кажуць, стараліся нацэліць бомбамі ў кожны свой налёт»[13]. А. Станюта працягваў: «Казалі, Грызадубава, знатная лётчыца, гераіня, яе звяно ці эскадрылля бамбілі Дом урада аднойчы на свята 8 Сакавіка, – бомбы леглі паблізу, у жылы квартал: вуліца Берсана, Трубны завулак...»[14].

Нямецкія ўлады праводзілі частковы знос руін, а таксама спрабавалі скончыць некаторыя пачатыя ў 1941 годзе, пры савецкай уладзе, будоўлі.

З 15 лістапада 1943 года нямецкія ўлады аб'явілі Менск на становішчы абложанага горада. Пачалося стварэнне двух паясоў абароны, у якія былі ўключаны і бетонныя ўмацаванні – г. зв. доты (рус. *долговременная огневая точка*). Доты ставілі звычайна з жалезабетону. Іх не маглі знішчыць нават авіябомбы і мінамёты. Некалькі такіх аб'ектаў захаваліся да нашых дзён. Паміж дамамі № 7 і 17 на вул. Дразда, недалёка ад чыгуначнага пераезда, ацалеў дот са сценамі таўшчынёй каля 40 см. Дот у форме конуса, што дазваляла весці кругавы абстрэл, знаходзіцца ля будынка на пр. Пераможцаў, 23, к. 3 (два рады былых амбразур забетанаваны). У доце ля жылога дома на вул. Чарнышэўскага, 12 мясцовыя жыхары зрабілі падвал. Дот нагадвае літару Г і меў дзве амбразуры. Таўшчыня сцен – каля 50 см[15]. Яшчэ адзін дот, паводле інфарма-

---

[12] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні…*, с. 301.

[13] А. Станюта, *Стэфанія*, Мінск 1994, с. 136.

[14] *Ibidem*, с. 137.

[15] А. Друпов, А. Чернушевич, *ДОТы – отметины времени. Немецкие фортификационные сооружения ВМВ в Минске* [online], http://www.fortressby.com/index.php?option=com_deeppockets&task=catContShow&cat=60&id=104&Itemid=5 [доступ: 15.01.2017].

цыі А. Рудака, захаваўся паміж дамамі № 83 і 85 на пр. Незалежнасці.

У канцы чэрвеня 1944 года, незадоўга да эвакуацыі немцаў з Менска, акупацыйныя ўлады пусцілі новы трамвайны маршрут ад станцыі Rollbahn да Güterbahnhof. Як паведамляла тагачасная прэса, «датуль трамвай ездзіў толькі па маршруце Rollbahn – Helmholtzstraße»: «На рагу Helmholtzstraße, ранейшай канцавой станцыі трамвая, прадстаўнікі нямецкай і беларускай адміністрацыі сабраліся для першай паездкі па новым маршруце. Нанова пафарбаваны трамвай, упрыгожаны гірляндамі з яловых галін у нямецкіх і беларускіх колерах, быў гатовы да ўрачыстага пуску». Пуск трамвая адбыўся пры ўдзеле камісара Менска Бекера і обербурмістра Комара, які «перарэзаў бела-чырвона-белую стужку пад гукі аркестра, і цягнік з гасцямі стартаваў у першую паездку»[16].

Аднак ужо 28 чэрвеня 1944 года пачалася эвакуацыя немцаў з Менска. 1 ліпеня, у апошні дзень эвакуацыі, спецыяльныя каманды пачалі ўзрываць раней замініраваныя будынкі, але не паспелі ажыццявіць задуманае ў поўным аб’ёме[17].

3 ліпеня 1944 года Чырвоная Армія заняла Мінск. Але яшчэ 23 ліпеня на горад быў зроблены апошні нямецкі налёт – на раён чыгуначнага вузла[18].

У гэтым артыкуле зроблена спроба сабраць некаторыя матэрыялы пра асобныя будынкі Мінска, якія захаваліся да нашых дзён і звязаны з падзеямі 23 чэрвеня 1941 – 23 ліпеня 1944 года: паміж першай і апошняй нямецкай бамбардзіроўкай горада, якія з’яўляюцца храналагічнымі межамі перыяду, у які горад быў непасрэдна закрануты падзеямі Другой сусветнай вайны.

Інфармацыя пра будынкі згрупавана паводле іх сучасных адрасоў. Гісторыя аб’ектаў да 1941 і пасля 1944 года адлюстравана выба-

---

[16] „Minsker Zeitung” 1944, 22. Juni.

[17] И. Воронкова, *Минск и минчане…*, с. 471.

[18] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні…*, с. 301.

рачна, калі гэта неабходна для асвятлення іх лёсу ў перыяд нямецкай акупацыі[19].

*Аляксандраўскі сквер.* Будынак былога політэхнічнага інстытута (сучасны пр. Незалежнасці, 65) у 1941 годзе выкарыстоўваўся нямецкімі акупантамі для размяшчэння раненых ваеннапалонных, якіх пасля папраўкі накіроўвалі ў канцлагеры. Адна з падпольных груп, якая дапамагала палонным чырвонаармейцам, была створана Кірылам Трусом, рабочым вагонарамонтнага завода імя А. Ф. Мяснікова, і супрацоўніцай 3-й савецкай бальніцы Вольгай Шчарбацэвіч[20]. Не раней за сярэдзіну ліпеня 1941 года на вагонарамонтным заводзе імя А. Ф. Мяснікова была створана група падпольшчыкаў. У яе ўваходзілі рабочыя К. І. Трус, Яўгеній Сняжкоў (уладкаваўся на прадпрыемства па падложных дакументах на імя Валашчука). У пачатку жніўня 1941 года К. І. Трус пазнаёміў Я. В. Сняжкова на кватэры Пелагеі Радзевіч з групай падпольшчыкаў, у якую ўваходзілі сама П. Радзевіч, В. Ф. Шчарбацэвіч, Зінаіда Шчарбацэвіч, «рудавалосы Валодзя» [Шчарбацэвіч. – *В. К.*], Іваноў (Зорын). В. Ф. Шчарбацэвіч дзейнічала разам з сястрой Надзеяй (Дзінай) і яе мужам Янушкевічам, сынам У. Шчарбацэвічам, братам Пятром Шчарбацэвічам, суседзямі па доме. Група В. Ф. Шчарбацэвіч вывела з лазарэта ў політэхнічным інстытуце і ўладкавала на часовае пражыванне ў Менску 18 камандзіраў і палітработнікаў Чырвонай Арміі. Сярод тых, хто забяспечваў чырвонаармейцаў пашпартамі і прапіскай у нямецкай паліцыі, былі начальнік даваеннага пашпартнага стала Абадоўскі (ён меў незапоўненыя пашпарты былога 4-га аддзялення міліцыі і пячатку), Васілій Адзінцоў (прыбыў у Мінск з Таджыкістана 19 чэрвеня 1941 года – да маці і ся-

---

[19] Падрабязныя звесткі па гісторыі ўключаных у спіс будынкаў гл.: В. Корбут, Д. Ласько, *Мінск. Спадчына старога горада. 1067–1917*, Мінск 2016; Idem, *Мінск. Спадчына сталіцы Беларусі. 1918–2018*, Мінск 2017.

[20] А. Літвін, *Акупацыя Беларусі (1941–1944): пытанні супраціву і калабарацыі*, Мінск 2000, с. 43–44.

стры). В. М. Адзінцоў пазнаёміўся з В. Ф. Шчарбацэвіч, яе сынам У. Шчарбацэвічам, яе сястрой Дзінай Янушкевіч, а яны звязалі В. М. Адзінцова з медсёстрамі ў шпіталі былога політэхнічнага інстытута. Чырвонаармейцаў размясцілі па кватэрах. У гэтай справе дапамагалі Клава і Валя, якія называлі сябе членамі Трасцянецкай групы камсамола. У жніўні 1941 года некаторыя з уратаваных чырвонаармейцаў вырашылі прарвацца за лінію фронту. Яны выйшлі за межы Менска ў кірунку Смілавіч. Уперад у якасці разведчыцы была паслана В. Ф. Шчарбацэвіч. Але, не дайшоўшы да Смілавіч, ля в. Драчкава група была арыштавана паліцыяй. Чырвонаармейцы, а разам з імі У. Шчарбацэвіч, былі арыштаваны, пасаджаны ў менскую гарадскую турму. Ля в. Драчкава былі адразу расстраляны немцамі Левіт, Савіцкі і два капітаны – усе яны былыя ваеннаслужачыя і яўрэі. Сярод затрыманых быў старшы лейтэнант Рудзянка, адзін з тых, каго ўратавалі са шпіталя політэхнічнага інстытута: ён пайшоў на супрацоўніцтва з немцамі і выдаў ім усіх падпольшчыкаў (у 1951 годзе ў СССР быў прыгавораны да вышэйшай меры пакарання). Неўзабаве, паводле даносу Рудзянкі, былі затрыманы В. Ф. Шчарбацэвіч, яе брат, сястра Дз. Янушкевіч, яе муж Янушкевіч, суседкі па кватэры Зоя Маркевіч і Алена Астроўская, камісар Зорын, Істомін, Грабеннікаў (лёс апошніх двух невядомы). З. Маркевіч і А. Астроўская неўзабаве былі вызвалены. А. Астроўская паспела папярэдзіць аб здрадзе Рудзянкі медсясцёр Агату Петухоўскую і Міхайліну Зароўскую. Праз дзень А. Астроўскую зноў арыштавалі. В. Ф. Шчарбацэвіч была павешана разам з мужам сястры Янушкевічам у цяперашнім Аляксандраўскім скверы. Леанід Зорын, Пётр і Надзея Шчарбацэвічы (брат і сястра В. Ф. Шчарбацэвіч) былі павешаны ля дома на вул. Карла Маркса 12. Валодзя Шчарбацэвіч быў павешаны на браме дражджавога завода. Усе пакаранні смерцю адбыліся 26 кастрычніка 1941 года – гэта былі першыя публічныя акцыі такога кшталту, арганізаваныя нямецкімі акупантамі. У той жа дзень былі павешаны А. Астроўская (паводле сведчанняў суседзяў па кватэры, ля Камароўскага рынку, разам

з двума мужчынамі), Мікалай Кузняцоў. Усяго былі пакараны смерцю 12 чалавек. Але цяпер вядомы імёны не ўсіх з іх[21].

Пакаранне смерцю падпольшчыкаў і чырвонаармейцаў выконвалі немцы і салдаты 2-га літоўскага батальёна дапаможнай паліцыі пад камандаваннем маёра Імпулявічуса, сфарміраванага ў жніўні 1941 года ў Каўнасе і ў складзе 23 афіцэраў і 464 радавых накіраванага ў раён Менска, Койданава, Смілавіч, Лагойска, Плешчаніц, Дзяржынска, Барысава і Слуцка. Як успамінаў адзін з салдат батальёна Зіманас Юодзіс, ён быў адным з тых, хто суправаджаў прыгавораных да смерці: «Іх суправаджалі нямецкія салдаты з сабакамі. Рукі арыштаваных былі звязаны. На грудзях віселі таблічкі, на якіх па-нямецку, па-руску напісана, што гэтыя людзі – савецкія партызаны. Арыштаваных прывялі ў гарадскі сад. Там іх павесілі. Траіх мужчын і жанчыну павесілі Кнірымас, Варнас і іншыя з нашага атрада»[22]. Паводле Юозаса Кнірымаса, гэта адбылося ў нядзелю, а 9–10 гадзіне раніцы: «Камандзір батальёна Імпулявічус павёў батальён у цэнтр Менска да турмы. […]

Пасля таго, як салдаты былі пастроены, адчынілася турэмная брама і з двара турмы выгналі групу людзей, якая складалася з мужчын і жанчын. Я помню толькі дзвюх жанчын, а іншыя былі мужчыны. Колькі было мужчын, не памятаю, але здаецца, чалавек сем-восем. Яны былі размеркаваны групамі па тры чалавекі». Паводле Ю. Кнірымаса, на загад А. Гецявічуса вешалі ахвяр Варнас, Шымоніс, Кнірымас, Вяпраўскас, Неніс: «Мы павінны былі накінуць петлі на асуджаных. Наколькі памятаю, у гарадскім садзе павесілі чацвярых – трох мужчын і адну жанчыну. Петлі накідвалі Шымоніс і Варнас. У гарадскім садзе вешалі ў двух месцах па два чалавекі». Падчас павешання В. Ф. Шчарбацэвіч вяроўка абарвалася, якую Ю. Кнірымас, паводле яго слоў, «падтрымаў, пакуль Варнас прымацоўваў вяроўку». Таксама Ю. Кнірымас удзельні-

[21] *Ibidem,* c. 44–47.
[22] *Ibidem,* c. 47–49.

чаў у павешанні «на тэлеграфных слупах, да якіх былі прыбіты бярвёны»: «Мужчыну павесіў […] Вяпраўскас. Я павесіў жанчыну. […] Апрача гэтага, іншых арыштаваных вешалі ў іншых мясцінах г. Менска, але хто вешаў я не бачыў, толькі ведаю, што салдаты нашага батальёна. […] Пакараннем смерцю кіраваў Гецявічус»[23].

Відавочца падзей Вячаслаў Кавалевіч, якому ў 1941 годзе было 14 гадоў, сярод тых, каго вялі ад турмы да цяперашняга Аляксандраўскага сквера па тагачаснай вул. Савецкай, пазнаў «цёцю Олю» – В. Ф. Шчарбацэвіч, якую павесілі разам з двума мужчынамі: «Калі вешалі цёцю Олю, вяроўка абарвалася. Падбеглі два фашысты – падхапілі, а трэці замацаваў вяроўку». Потым В. А. Кавалевіч убачыў чарговую групу, якую вялі на павешанне да дражджавога завода, і пазнаў сярод асуджаных У. Шчарбацэвіча[24].

На грудзях В. Ф. Шчарбацэвіч вісела фанерная таблічка з надпісам на рускай і нямецкай мовах: «Мы партизаны, – стрелявшие по германским солдатам». Паводле фотаздымкаў, зробленых 26 кастрычніка 1941 года, сярод павешаных у Аляскандраўскім скверы можна апазнаць М. Кузняцова. На фотаздымках, зробленых 26 кастрычніка, адлюстравана таксама невядомая, якую з К. І. Трусом і У. Шчарбацэвічам вялі па вул. Энгельса. На грудзях у жанчыны вісела фанерная таблічка з надпісамі на рускай і нямецкай мовах: «Мы партизаны, – стрелявшие по германским войскам». На думку А. Літвіна і М. Шумейкі, няма пераканаўчых даных, якія б дазволілі апазнаць у ёй Машу Брускіну, адпаведна, прылічыць яе да павешаных на браме дражджавога завода[25].

У 1979 годзе на ўваходзе ў цяперашні Аляксандраўскі сквер быў устаноўлены памятны знак з надпісам: «На этом месте гитлеровцы казнили советских патриотов в годы Великой Отечественной войны. Среди многих других отдали жизнь за Родину секретарь Минского

23 *Ibidem,* с. 50.
24 *Ibidem,* с. 51.
25 *Ibidem,* с. 51–57.

подпольного горкома КП(б)Б И. П. Казинец, подпольщики – Н. Г. Демиденко, О. Ф. Щербацевич, Н. Ф. Янушкевич, П. Ф. Янушкевич. И. П. Казинцу посмертно присвоено звание Героя Советского Союза». Паводле І. Варанковай, асобы, пералічаныя на памятным знаку (апрача В. Ф. Шчарбацэвіч), павешаны ў іншых месцах горада.

*Аранская вул., 9.* Паводле П. Растоўцава, у 1941–1944 гадах будынак займаў 3-і ўчастак паліцыі.

*Бабруйская вул., 11, Ленінградская, 16.* У 1941–1944 гадах у былых карпусах Універсітэцкага гарадка знаходзіўся нямецкі вайсковы шпіталь.

*Бабруйская вул., 3.* Паводле фотаздымка мая 1941 года, у гэты час заканчвалася ўзвядзенне чацвёртага паверха дома[26]. Паводле фотаздымка другой паловы 1941 года, дом быў к таму часу дабудаваны, але не атынкаваны і стаяў без даху. На аэрафотаздымку 1943 года відаць, што ў той час дом ужо меў страху. Паводле П. Растоўцава, на плане Менска, складзеным у канцы 1943 года на падставе даных партызанскіх сувязных, пазначана, што ў будынку размяшчаліся аддзелы нямецкай Галоўнай дырэкцыі чыгункі – Цэнтр (Haupteisenbahndirektion – Mitte) (галоўная сядзіба знаходзілася ў былым Доме Урада) і казарма чыгуначнікаў. Там жа мясціліся гандлёвыя прадпрыемствы будаўнічых матэрыялаў, санітарная ўстанова. Будынак ахоўваўся малакалібернай зенітнай гарматай.

*Бабруйская вул., 5а.* У 1941–1944 гадах у будынку размяшчалася аўтаматычная тэлефонная станцыя[27].

*Валадарскага вул., 3.* Паводле фотаздымка Курта Лёхмана (Curt Lohmann), зробленага ўлетку 1941 года, і карты ліпеня 1943 года, у будынку ў гэты час знаходзіўся аддзел працы (Arbeitsamt) Менскай гарадской управы.

---

[26] Д. Ескевіч, О. Батоева, *op. cit.*, с. 9.

[27] *История университетского городка* [online], http://www.bsu.by/ru/main.aspx?guid=203241 [доступ: 9.03.2017].

*Валадарскага вул., 5.* Будынак быў пастаўлены ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя ў стылі эклектыкі як харальная сінагога. Паводле краязнаўца В. Зелянкова, у 1941–1944 гадах тут знаходзіўся Einsatzstab Reichsleiter Rosenberg für die besetzten Gebiete – Hauptarbeitsgruppe Ostland. Цяпер тут Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага.

*Веры Харужай вул., 2.* У памяць пра А. Астроўскую (гл. вышэй) на будынку ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

*Вялікі Трасцянец вёска (Мінскі раён).* У 1963 годзе ў вёсцы быў устаноўлены абеліск з надпісам: «Тут, у раёне вёскі Трасцянец, нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі, закатавалі, спалілі 201500 чалавек – мірных грамадзян, партызан, ваеннапалонных Савецкай Арміі. 1941–1944 гг.». Сярод мірных жыхароў – мянчане. Побач знаходзіцца абеліск з надпісам: «Здесь похоронены воины Советской Армии, погибшие при освобождении города Минска – июль 1944 г. Бессмертен ваш подвиг».

*Гебелева вул., 5.* Паводле П. Растоўцава, на нямецкім плане 1941 года будынак пазначаны як «школа ля яўрэйскіх могілак».

*Дабрамысленскі зав., 3.* Паводле П. Растоўцава, першапачаткова ў гэтым жылым доме было сем пад’ездаў. Будынак захаваўся к 3 ліпеня 1944 года. Але неўзабаве немцы зрабілі некалькі начных авіяналётаў на мінскі чыгуначны вузел. Падчас апошняй моцнай начной бамбардзіроўкі 22 ліпеня частка дома была моцна разбурана. На аэрафотаздымках відаць, што 15 ліпеня дом яшчэ стаіць цэлы, а 22 ліпеня тры пад’езды разбураныя. У 1966 годзе на доме была ўстаноўлена мемарыяльная дошка, у 1984-м заменена на новую[28], цяпер вісіць трэцяя па ліку з надпісам: «У кватэры № 53 гэтага дома ў 1942 г. дзейнічала рацыя савецкіх разведчыкаў. Гаспадарамі кватэры былі падпольшчыкі А. Д. і М. Т. Загорскія».

---

[28] *Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінск*, гал. рэд. С. Марцэлеў, Мінск 1988, с. 74–75.

*Даўгабродская вул., 29.* У 1939 годзе было прынята рашэнне пабудаваць Мінскі авіяцыйны завод № 453[29]. Паводле некаторых звестак, у 1942 годзе немцы дабудавалі завод і арганізавалі тут вытворчасць мінашукальнікаў і радыёапаратуры для самалётаў, а таксама рамонт транспартных самалётаў. На заводзе працавалі восем тысяч чалавек, інжынерна-тэхнічны персанал складалі пераважна немцы[30]. У канцы 1944 года завод пачалі аднаўляць як авіяцыйны. 29 мая 1946 года Савет Міністраў СССР прыняў пастанову аб стварэнні тут Мінскага трактарнага завода[31].

*Дзяржынскага пр.* 7 лістапада 2013 года на пагорку ў раёне злучэння вул. Чыгуначнай з пр. Дзяржынскага быў адкрыты мемарыяльны комплекс на ўшанаванне салдат Чырвонай Арміі, пахаваных у брацкай магіле. Цэнтральная частка кампазіцыі – жанчына ў жалобе, якая сціскае ў руках пілотку чырвонаармейца. Першы памятны знак тут быў пастаўлены ў 1981 годзе.

*Залатая Горка вул., 18, к. 2.* У 1941–1944 гадах у былой школе знаходзіўся нямецкі вайсковы шпіталь.

*Захарава вул., 59.* Паводле П. Растоўцава, на нямецкім плане 1942 года дом пазначаны як месца размяшчэння дапаможнай вайсковай часці (Landesschützen).

*Індустрыяльная вул.* У 1941–1944 гадах гарадская электрастанцыя № 2 была пашкоджана, к канцу 1945 года адноўлена[32]. У жніўні 1941 – маі 1942 года на ГЭС дзейнічала падпольная група з 20 чалавек на чале з М. Яраслаўцавым (загінуў). У студзені 1942 года падпольшчыкі ўзарвалі вадапомпавую станцыю, у лютым – адзін з катлоў, у сакавіку вывелі са строю галоўны пульт кіравання ГЭС. У маі, перад пагрозаю раскрыцця групы акупантамі, боль-

---

[29] В. Кірычэнка, *Мінск. Гісторыя пасляваеннага аднаўлення. 1944–1952 гг.*, Мінск 2004, с. 12.

[30] И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 29.

[31] В. Кірычэнка, *op. cit.*, с. 12.

[32] *Минская ТЭЦ-2* [online], http://operby.com/minskaya-tec-2.html [доступ: 8.01.2017].

шая частка падпольшчыкаў сышла ў партызаны. З верасня 1941 да 3 ліпеня 1944 года на прадпрыемстве дзейнічала падпольная група на чале з Дз. Гняўко. Яна аб'ядноўвала 18 слесараў, электраманцёраў і інш. Падпольшчыкі сабатавалі падачу электраэнергіі на нямецкія аб'екты, выводзілі са строю генератары і іншае абсталяванне. У пачатку лютага 1944 года ўзарвалі трансфарматарны пункт, пакінулі без электраэнергіі вайсковыя казармы і склады, было перапынена забеспячэнне электрычнасцю многіх установаў горада. Падпольшчыкі не дапусцілі падрыву ГЭС перад адступленнем немцаў з Менска[33].

*Казлова вул.* Залатагорскія могілкі дзейнічалі ў 1796–1893 гадах, пазней дазвалялася хаваць нябожчыкаў толькі ў сямейных скляпах, па спецыяльным дазволе[34]. Захаваўся фотаздымак мая 1943 года, на якім адлюстраваны генеральны камісар Беларусі В. Кубэ, які наведвае могілкі.

*Казлова вул.* Вайсковыя могілкі існуюць з 1840-х гадоў[35]. Сярод пахаваных: апошні даваенны галоўны архітэктар Мінска Г. Якушка (1942 год), грамадска-палітычны дзеяч Ф. Акінчыц (сакавік 1943 года), сябры Саюза беларускай моладзі. Сябры СБМ загінулі падчас тэракта ў Менскім гарадскім тэатры 22 чэрвеня 1943 года[36]. На могілкі 25 чэрвеня быў арганізаваны «вялікі жалобны паход, рушачы галоўнай вуліцаю»: «Кажная дамавіна пакрытая бел-чырвона-белым сьцягам і засыпаная краскамі й вянкамі. […] Разам у жалобным паходзе плылі аўтамабілі розных урадавых нямецкіх установаў. […] Сьвятар а. Кушнер, адправіўшы адпаведныя

[33] *Збор помнікаў…*, с. 45.

[34] *Nasze Kościoły. Djecezja Mińska*. T. 2. Zesz. 11. Red. J. Żyskar, Warszawa 1913, s. 13.

[35] *Церкви и приходы Минска. История и современность*, Минск 1996, с. 42; Г. Шэйкін, *Храм-помнік на Вайсковых могілках у Мінску*, «Беларускі гістарычны часопіс» 1998, № 2, с. 49.

[36] В. Кубэ, *Новы бальшавіцкі тэрарыстычны акт на мірнае жыхарства Менску*, «Беларуская Газэта» 1943, № 47.

малітвы, сказаў прамову царкоўна-нацыянальнага зьместу. У канцы над магілаю прамовіў старшыня сталічнага гораду праф. Д-р. Іваноўскі. „– Дарагія нашыя нябожчыкі: Андрэй Братко, Яраслаў Кушаль, Кастусь Мокат, Тамара Насеньнік, Марыя Негіна, Марыя Сабалеўская, Леанід Слаўнін і Вы, трое непазнаных”. […] Пасыпалася беларуская зямліца, каб закрыць навекі ахвяры бальшавіцкага злачынства»[37]. Аляксандр Станюта ўспамінаў: «Пахавалі ўсіх загінуўшых […] у брацкай магіле...»[38]. 20 мая 1945 года пісьменнік Г. Смоляр пісаў: «Марыя Канстанцінаўна Хайноўская наведваннем магілы Эдуарда Самуйлёнка ў часы нямецкай няволі як бы вяртала сабе кавалак шчасця тых дзён, калі яна, супрацоўніца Саюза савецкіх пісьменнікаў Беларусі, была сведкай буйнага росквіту таленту гэтага выдатнага пісьменніка»[39].

*Казлова вул., 11.* Падчас бамбардзіравання Мінска 24 чэрвеня 1941 года адна з фугасных бомб прабіла дах царквы Святога благавернага князя Аляксандра Неўскага, упала перад алтаром насупраць абраза святога Мікалая, але не ўзарвалася. Аднак выбуховай хваляй ад бомб, што падалі побач, быў сарваны галоўны купал храма, загарэўся дах, але неўзабаве полымя само згасла[40]. 28 чэрвеня 1941 года вернікі сарвалі замок і ўвайшлі ў храм – гэта была першая царква ў Менску, адкрытая пасля акупацыі горада немцамі. 5 ліпеня (паводле іншых звестак, 6-га) храм асвяціў протаіерэй У. Фінькоўскі, была адслужана першая літургія[41]. У царкве служыў а. І. Кушнер, які ў 1942 або 1943 годзе падарваўся на міне[42]. Пасля аднаўлення савецкай улады царква не была закрыта[43].

---

[37] М. Бакун, *Паховіны ахвяраў бальшавіцкага тэрору,* «Беларуская Газэта» 1943, 30 чырвеня.

[38] А. Станюта, *op. cit.*, с. 104.

[39] «Літаратура і мастацтва» 1945, 20 мая.

[40] *Церкви и приходы…*, с. 42; Г. Шэйкін, *op. cit.,* с. 47–50.

[41] *Церкви и приходы…*, с. 25, 42; Г. Шэйкін, *op. cit.*, с. 49.

[42] З. Пазьняк, *Гутаркі з Антонам Шукелойцем*, Warszawa, Vilnius 2003, с. 105.

[43] *Церкви и приходы…*, с. 26.

*Казлова вул., 15.* У 1941–1944 гадах у гэтым жылым доме знаходзілася аддзяленне Einsatzstab Reichsleiter Rosenberg – арганізацыі, якая займалася вывазам гісторыка-культурных каштоўнасцей з акупіраваных Германіяй тэрыторый[44].

*Кальварыйская вул., 3а.* На доме ўстаноўлена памятная дошка з надпісам: «У гэтым будынку ў 1941–1943 гадах знаходзілася бальніца, у якой дзейнічалі падпольныя антыфашысцкія групы Мінскага гета».

*Кальварыйскі праезд, 1.* Касцёл Узвышэння Святога Крыжа на Кальварыі перад Другой сусветнай вайной быў закрыты. Набажэнствы аднавіліся, паводле некаторых звестак, у 1942 годзе. Паводле У. Дзянісава, пасля 1944 года тут знаходзіліся майстэрні скульптараў.

*Кальварыйскі праезд.* Сярод пахаваных на Кальварыйскіх могілках – бурмістр Менска, старшыня Беларускай рады даверу пры генеральным камісары Беларусі В. Іваноўскі (загінуў 6 снежня 1943 года). 16 снежня 2006 года адбылося ўрачыстае адкрыццё надмагільнага помніка.

*Камсамольская вул., 25.* Чатырохпавярховы жылы будынак адлюстраваны на фотаздымку канца чэрвеня 1944 года як не атынкаваны, магчыма, пасля пажару. Як сведчыць фотаздымак 1948 года, у гэты час дом ужо быў заселены.

*Камсамольская, вул. 31 / Карла Маркса, 16.* Будынак быў узведзены ў 1936–1938 гадах[45] для Народнага камісарыята лясной прамысловасці БССР[46]. У 1941–1944 гадах, як сведчыў зафіксаваны на фотаздымках надпіс Der Stadtkomissar Minsk на рагу другога паверха, тут знаходзіўся Менскі гарадскі камісарыят.

---

[44] *Bacian.livejournal.com* [online], http://bacian.livejournal.com/63821.html [доступ: 15.01.2016].

[45] В. Денисов, О. Кукуня, *Улица Лошицкая – Базарная – Подгорная – Карла Маркса* [online], https://ais.by/story/1445 [доступ: 6.01.2017].

[46] *Белорусский производственно-торговый концерн лесной, деревообрабатывающей и целлюлозно-бумажной промышленности* [online], http://bellesbumprom.by/ru/o-kontserne/istoriya [доступ: 7.01.2017].

*Караля вул., 16а.* Паводле П. Растоўцава, ёсць звесткі, што ў гэтым будынку знаходзіліся яўрэі з Гамбурга, якіх нацысты прывезлі ў Менск на знішчэнне ўвосень 1941 года.

*Караткевіча вул., 9а.* 7 лістапада 1933 года з Лошыцкага аэрадрома вылецеў першы самалёт[47]. Раніцай 23 чэрвеня 1941 года першыя нямецкія самалёты-знішчальнікі, якія прарваліся да Мінска, абстралялі аэрадром[48]. У другой палове дня яго бамбардзіравалі 11 разоў. Там стаялі два знішчальныя палкі, якія прыбылі ў Мінск 22 чэрвеня з Магілёўскай і Віцебскай абласцей. Замаскіраваць самалёты не паспелі, і немцы ліквідавалі большасць машын проста на зямлі[49]. На зробленым пасля 25 чэрвеня 1941 года фота відаць, што будынак аэравакзала цэлы. Але на здымку 25 ліпеня дом адлюстраваны напаўразбураны. Падчас акупацыі аэрапорт меў назву Minsk-Süd. Пасля 1944 года будынак аэравакзала быў адноўлены і выконваў свае функцыі да 1957 года[50].

*Карла Маркса вул., 29.* У 1939–1941 гадах – Дзяржаўная карцінная галерэя БССР. 26 чэрвеня 1941 года дырэктар галерэі М. Міхалап сышоў з Мінска, замкнуўшы памяшканне на ключ. Экспазіцыя была разрабавана салдатамі вермахта і мясцовымі жыхарамі[51]. Паводле А. Шукелойця, «з надыходам акупацыі ў першыя ж дні лепшыя абразы, слуцкія паясы й мастацкія вырабы былі вывезеныя ў Кёнігсбэрг»[52]. Паводле А. Станюты, з галерэі «прапала ў гады акупацыі» калекцыя твораў яго дзеда мастака М. Станюты[53]. Дачка мастака артыстка С. Станюта ўдакладняла: «„Партрэт дачкі" адшукала пасля вайны ў Германіі, куды яго вы-

---

[47] *Минск-1 (аэропорт)* [online], https://ru.wikipedia.org/wiki/Минск-1_(аэропорт), [доступ: 8.01.2017].

[48] И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 146.

[49] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні…*, с. 299.

[50] Idem, *Дома, хранящие историю*, «Советская Белоруссия» 2014, 3 сентября.

[51] Idem, *Минск. Лучший вид на этот город*, Минск 2013, с. 187.

[52] А. Шукелойць, *Менск пад немцамі*, «Наша ніва» 1992, № 9.

[53] А. Станюта, *op. cit.*, с. 117.

везлі, і вярнула ў Мінск дырэктар нашага мастацкага музея Алена Васільеўна Аладава»[54].

*Карла Маркса вул., 31.* Паводле А. Шукелойця, паміж 1941 і 1944 гадамі ў выніку «налётаў савецкай авіяцыі» аднойчы «быў цалкам разьбіты будынак КІЖу (камуністычнага інстытуту журналістыкі) па вуліцы Карла Маркса – адзін з найпрыгажэйшых школьных будынкаў гораду»[55]. Паводле І. Варанковай, якая спасылаецца на сведчанне аднаго з партызанскіх разведчыкаў, бомба з савецкага самалёта пашкодзіла будынак у 1943 годзе[56]. Паводле справаздачы камісара партызанскага атрада «Праўда» Кузняцова, што захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, дом быў часткова разбураны падчас налёту савецкай авіяцыі 2 мая 1943 года. У 1947 годзе будынак быў адноўлены.

*Карла Маркса вул., 38.* 14 кастрычніка 1939 года члены Бюро ЦК КП(б)Б звярнуліся з просьбаю да «ЦК ВКП(б) пересмотреть решение от 19.IV.–1938 г. о […] переносе строительства дома ЦК КП(б)Б […] из г. Могилева в г. Минск»[57]. Планавалася, што «ў 1941 г. будзе скончана будаўніцтва Дома ЦК КП(б)Б і сумежнай да яго плошчы»[58]. Паводле пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 17 лютага 1941 года, у будынку збіраліся размясціць камандны пункт супрацьпаветранай абароны. Падземныя ўзроўні дома праектаваў маскоўскі інстытут «Метропроект». Але бракавала інжынераў і праходчыкаў, якія б мелі вопыт падземных работ. К пачатку красавіка 1941 года з Масквы прыбыў толькі адзін спецыяліст[59]. Паводле сакратара ЦК КП(б)Б па кадрах М. Аўхімовіча, 24 чэрвеня 1941 года супрацоўнікі ЦК спрабавалі ўладкавацца ў падвалах недабудаванага будынка, аднак працаваць там было цяжка, бо ў той час усё памяшканне было аддадзена

[54] *Ibidem*, с. 119.
[55] А. Шукелойць, *op. cit.*
[56] И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 289.
[57] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні...*, с. 200.
[58] Д. Ескевіч, О. Батоева, *op. cit.*, с. 8.
[59] И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 110.

пад showішча сем'ям работнікаў ЦК. Паводле карэспандэнта газеты «Правда» П. Лідава, у падвалах размяшчаўся аператыўны штаб ЦК КП(б)Б[60]. Паводле некаторых звестак, к 1 мая 1943 года будынак мусіў быць гатовы да пераезду сюды Генеральнага камісарыята Беларусі. Будаўнічыя работы вяла арганізацыя Тодта. У красавіку савецкі бамбардзіроўшчык скінуў побач некалькі авіябомб, у выніку, у будынку з'явіліся расколіны і спатрэбіўся больш сур'ёзны рамонт. Сюды былі накіраваны работнікі з яўрэйскага гета. Пярэбары Генеральнага камісарыята адбыліся ў чэрвені 1943 года. Кабінет В. Кубэ знаходзіўся на другім паверсе, яго вокны выходзілі на сучасны Аляксандраўскі сквер[61]. Як сведчаць фотаздымкі, над другім паверхам дома знаходзілася шыльда з надпісам Generalkomissar für Weissruthenien. Захавалася фотахроніка, на якой відаць В. Кубэ, які прымаў тут дэлегацыі. 3 ліпеня 1944 года сапёры выявілі ў будынку нямецкія выбуховыя прыстасаванні[62].

*Кастрычніцкая вул., 14.* У 1921–1922 гадах у будынку пачаў дзейнічаць дражджавы завод «Чырвоная зорка»[63]. У 1976 годзе на фасадзе была ўстаноўлена мемарыяльная дошка з надпісам: «Здесь 26 октября 1941 года фашисты казнили советских патриотов К. И. Труса, В. И. Щербацевича и М. Б. Брускину» (прозвішча М. Брускінай дададзена ў 2008 годзе). Пералічаныя асобы былі павешаны на браме дражджавога завода[64]. Гл. вышэй.

*Кастрычніцкая вул., 16.* У 1941–1944 гадах на былым Менскім машынабудаўнічым і ліцейным заводзе імя К. Я. Варашылава рамантавалі нямецкія танкі. У канцы чэрвеня 1942 года ў выніку налёту савецкай авіяцыі быў знішчаны механічны цэх. 3 ліпеня 1944 года сапёры выявілі выбуховыя прыстасаванні, якія павінны былі прывесці

---

[60] *Ibidem*, с. 175.

[61] О. Усачев, *Явные и тайные резиденции Кубе* [online], http://minsk-old-new.com/life/war1941-1945/yavnye-i-tajnye-rezidencii-kube [доступ: 22.01.2018].

[62] И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 319.

[63] *Мінск незнаёмы. 1920–1940*, аўтар-укл. І. Куркоў, Мінск 2002, с. 13.

[64] *Збор помнікаў…*, с. 94.

да ўзрыву прадпрыемства[65]. На будынку ў 1967 годзе ўстанавілі мемарыяльную дошку ў гонар 45 удзельнікаў падпольнай арганізацыі, якая дзейнічала на прадпрыемстве ў 1941–1944 гадах[66]. Падполле актывізавалася з ліпеня 1942 года, калі акупанты арганізавалі на заводзе рамонт танкаў і самаходных гармат. Увосень 1942 года падпольшчыкі падпалілі цэх акумулятараў, у пачатку 1943-га вывелі са строю каларыфер, які даваў цяпло ў цэхі. Улетку 1943 года здабылі і перадалі партызанам звесткі пра тэхнічныя і баявыя характарыстыкі танкаў «тыгр» і «пантэра». У лістападзе-снежні 1943 і лютым-маі 1944 года большасць падпольшчыкаў была арыштавана[67].

*Кастрычніцкая вул., 25.* На гарбарні «Бальшавік» упершыню ў СССР у 1938 годзе пачалі вырабляць высакаякасную хромавую скуру са свіных шкур[68]. У 1941–1944 гадах выраблялі скуру і аўчыну для кажухоў[69]. На будынку змешчана мемарыяльная дошка з надпісам: «На этом заводе в годы Великой Отечественной войны бесстрашно боролись против фашистских захватчиков советские патриоты-подпольщики». Падпольная група дзейнічала ў жніўні 1941 – ліпені 1944 года. У маі 1943 года сернай кіслатой была сапсавана вялікая колькасць скураных вырабаў, падрыхтаваных да адпраўкі ў Германію. Скуры з завода перапраўляліся ў партызанскія атрады[70].

*Кірава вул., 13 / Валадарскага, 23.* 16 чэрвеня 1941 года ў Мінск прыбылі з першымі гастролямі акцёры Маскоўскага мастацкага акадэмічнага тэатра імя М. Горкага (МХАТ) і размясціліся ў гасцініцы «Беларусь». Як занатаваў 23 чэрвеня карэспандэнт газеты «Правда» П. Лідаў, «у нас в гостинице посмеиваются над артистами МХАТ, которые по тревоге спускаются в подвал. Кроме них, пожалуй, никто не верит в действительную возможность воздушной

---

[65] И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 28, 289, 319.
[66] *Збор помнікаў…*, с. 94.
[67] *Ibidem*, с. 94.
[68] *Мінск незнаёмы…*, с. 13.
[69] И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 29.
[70] *Збор помнікаў…*, с. 94–95.

бомбардировки». 24 чэрвеня артысты выехалі ў Маскву, пакінуўшы асабістыя рэчы ў адным з гасцінічных нумароў, у тым ліку «парадны» пінжак народнага артыста СССР І. Масквіна з ордэнам Леніна на лацкане[71]. У 1941–1944 гадах будынак гарэў.

*Кірыла і Мяфодзія вул., 3.* Будынак быў узведзены ў XVII стагоддзі як касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі. У Беларускім дзяржаўным архіве навукова-тэхнічнай дакументацыі захаваўся бланк канца 1920-х гадоў з шапкай: «Б.С.С.Р. Ц.В.К. Цэнтральнае архіўнае кіраўніцтва. Менск, вул. Бакуніна, д. № 3». Паводле А. Шукелойця, да нямецкай акупацыі тут знаходзіўся «архіў рэвалюцыі», якім апекавалася сп-ня Дзяржынская, а пасля яго «давялося звальняць для праваслаўнай царквы». Будынак перадала вернікам Менская гарадская ўправа[72]. У 1943 годзе царкву асвяціў архіепіскап Ф. Нарко. Быў пастаўлены новы трох’ярусны іканастас. З таго часу храм дзейнічае, цяпер гэта Свята-Духаў кафедральны сабор – галоўны храм Беларускага экзархата Рускай праваслаўнай царквы (Беларускай праваслаўнай царквы).

*Кірыла і Мяфодзія вул., 4.* У Беларускім дзяржаўным архіве навукова-тэхнічнай дакументацыі, які цяпер знаходзіцца ў гэтым будынку (першапачаткова касцёл Святога Юзафа Абранніка Найсвяцейшай Панны Марыі), захаваўся бланк канца 1920-х гадоў з шапкай «Б.С.С.Р. Ц.В.К. Цэнтральнае архіўнае кіраўніцтва. Менскі гістарычны архіў. Гор. Менск. Бакуніна 4». Паводле А. Шукелойця, у 1941 годзе «ў Гістарычным архіве (у былым касьцёле бэрнардынцаў) засталася адна маладая прафэсійная працаўніца, сп-ня Дзяржынская, якая адважна бараніла фонды ад розных валацугаў і зарганізавала нармальную дзейнасьць гэтае ўстановы. Архіў камплектаваў па тры асобнікі ўсіх выдаваных кніжак, газэт, лятучак, легальных і нелегальных»[73].

[71] И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 88, 147, 232.
[72] А. Шукелойць, *op. cit.*
[73] *Ibidem.*

*Кірыла і Мяфодзія вул., 5.* У 1943 годзе ў будынку былога кляштара бернардзінак XVII–XIX стагоддзяў адкрыўся Свята-Духаў мужчынскі манастыр, у якім жылі тры насельнікі[74]. Памяшканні перадала рэлігійнай грамадзе Менская гарадская ўправа[75].

*Кісялёва вул., 30.* У перыяд нямецкай акупацыі заснаваны яшчэ ў другой палове XIX стагоддзя бровар працягваў выпускаць прадукцыю. У 1941 годзе тут была створана падпольная арганізацыя, якая распаўсюджвала газету «Звязда». 6 кастрычніка 1942 года падпольшчыкаў арыштавалі[76]. Увесну 2003 года на фасадзе будынка быў раскрыты, а пасля зафарбаваны надпіс 1941–1944 гадоў Brauerei Minsk («Менскі бровар»)[77].

*Кісялёва вул., 42.* 22 ліпеня (4 жніўня) 1941 года, у дзень памяці святой роўнаапостальнай Марыі Магдаліны, царква Святой Роўнаапостальнай Марыі Магдаліны была зноў адкрыта і асвячона. Вёўся рамонт. Настаяцель протаіерэй К. Шашко, які служыў у храме падчас нямецкай акупацыі, пасля аднаўлення савецкай улады быў арыштаваны і асуджаны да дзесяці гадоў зняволення. У кастрычніку 1949 года царкву закрылі[78].

*Кульман вул.* Ля будынка на вул. Кульман, 14 у 1983 годзе быў устаноўлены мемарыяльны знак на месцы дома, дзе ў 1942 годзе знаходзілася падпольная друкарня Менскага гаркама ЦК КП(б)Б, у якой выйшлі другі (у жніўні) і трэці (у верасні) нумары падпольнай газеты «Звязда»[79].

*Леніна вул.* Паводле некаторых звестак, помнік У. Леніну каля цяперашняй 3-й гарадской клінічнай бальніцы імя Я. У. Клумава

---

[74] *Церкви и приходы…*, с. 25.

[75] А. Шукелойць, *op. cit.*

[76] Т. Степанова, *Один из минских трудяг-старожилов*, «Минский курьер» 2002, № 29.

[77] Д. Шаровар, *Привидение из 1942 года*, «Советская Белоруссия» 2003, 8 апреля.

[78] В. Корбут, Д. Ласько, *Мінск. Спадчына старога…*, с. 162.

[79] *Збор помнікаў…*, с. 104.

быў пастаўлены ў 1936 годзе[80]. Паводле іншых звестак, у скверы з боку вул. Ленінскай (цяпер Леніна) да 1941 года стаялі два бюсты – У. Леніна і І. Сталіна. Е. Мірановіч, старшая сястра першага вочнага аддзялення, заслужаны работнік аховы здароўя БССР, якая працавала ў бальніцы з 1954 года, расказвала ў 2005-м, што супрацоўнікі бальніцы муж і жонка П. і З. Мурашкі ў пачатку нямецкай акупацыі схавалі бюсты Сталіна і Леніна. Пасля вызвалення горада ад немцаў бюст Леніна знайшлі. Галаву ад яго злучылі з выробленай новай фігурай і паставілі ў двары з боку стадыёна «Дынама». На помніку змешчана памятная дошка з надпісам: «Памятник Владимиру Ильичу Ленину в годы оккупации города Минска немецко-фашистскими захватчиками (1941–1944 гг.) спасен, сохранен сотрудниками больницы – семьей Мурашко. Восстановлен в 1945 г.»[81]. Паводле некаторых звестак, П. Мурашка у 1942 годзе быў зняволены ў канцлагеры «Трасцянец», у 1944 годзе вызвалены. Затым знайшоў схаваныя бюсты і змясціў іх на ранейшым месцы[82].

*Ленінградская вул., 3, 5.* У ліпені 1943 года ў менскай газеце „Minsker Zeitung" інжынер М. Бэкер апублікаваў крытычны агляд савецкай архітэктуры Менска, у якім дом на вул. Леніградскай, 3 прыводзіў як прыклад «прымітывізму» („Primitivität")[83]. 24 ліпеня 1941 года на вул. Ленінградскай, 5 размясцілася нямецкае намесніцтва Менскай акругі, якое з верасня ўзначальваў Р. Астроўскі[84]. Паводле Ю. Туронка, В. Іваноўскі з лістапада 1941 да восені 1942 года жыў у доме на вул. Ленінградскай (нумар будынка не называецца) «на адной кватэры з сваім сакратаром зь віленскага БНК Язэпам Найдзюком». Паводле Я. Найдзюка, ён жыў «разам з прафэ-

---

[80] *Ibidem*, с. 110.

[81] В. Корбут, *Минск…*, с. 212–214.

[82] Ю. Воронков, *Памятники В. И. Ленину в Белоруссии*, Минск 1976, с. 22.

[83] M. Becker, *Sowjet-Architektur. Wohnungsbau und Wohnungsfürsorge der Bolschewisten in Minsk*, „Minsker Zeitung" 1943, 11.Juli.

[84] *Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Мінска. У 4 кн. Кн. 4*, Мінск 2005, с. 51.

сарам Іваноўскім на агульнай кватэры па вуліцы Ленінградзкай. […] У Менску мы жылі вельмі сьціпла». Л. Галяк, які таксама жыў у доме на вул. Ленінградскай, прыгадваў пра «спатканьне Новага 1942 году ў В. Іваноўскага»: «Калі заціхла страляніна вітаньня Новага Году немцамі, прыйшоў павіншаваць з Новым годам немец, адміністратар дому»[85].

*Магілёўская вул., 68.* У кв. 2 у лістападзе 1941 – лістападзе 1943 года знаходзілася канспіратыўная кватэра падпольнай камсамольскай арганізацыі «Андрюша». Члены арганізацыі псавалі абсталяванне на хлебазаводзе «Аўтамат», гарадской электрастанцыі № 1, мініравалі цягнікі і чыгуначныя вагоны, ажыццявілі агулам каля 40 дыверсій. У ноч на 7 лістапада 1943 года былі арыштаваны гаспадары кватэры маці і сын А. і В. Аўчаровы. 7 лістапада сюды таксама прыйшла група падпольшчыкаў на чале з М. Кедышкам, які ў выніку перастрэлкі з немцамі быў забіты, іншым удалося ўцячы. У 1967 годзе на доме была ўстаноўлена мемарыяльная дошка ў гонар падпольшчыкаў[86].

*Максіма Багдановіча вул., 23 / Старажоўская, 2.* У выніку бамбардзіроўкі Мінска немцамі 24 чэрвеня 1941 года, паводле сведчання намесніка Старшыні СНК БССР І. Крупені, «в 3-м Доме Советов женщины и дети решили укрыться в подвале. Взорвавшаяся рядом бомба вызвала пожар. Огонь перекрыл все подъезды и подходы. Там погибло более 100 человек». На аэрафотаздымку 24 чэрвеня 1941 года відаць, што а 19.06 дом яшчэ гарэў. 25 чэрвеня а 5.30 фатограф зафіксаваў цэлы дах дома з боку сучаснай вул. Максіма Багдановіча і правал даху над крылом будынка з боку сучаснай вул. Старажоўскай[87]. У 1947 годзе будынак аднавілі.

*Максіма Багдановіча вул., 29.* У 1941–1944 гадах, паводле некаторых звестак, тут знаходзіліся школа і курсы Службы бяспекі

---

[85] Ю. Туронак, *Мадэрная гісторыя Беларусі*, Vilnius 2006, с. 232–233.

[86] *Збор помнікаў…*, с. 148.

[87] С. Крапивин, *Дом у Троицкого предместья* [online], http://minsk-old-new.com/minsk-3289-ru.htm [доступ: 15.01.2017].

рэйхсфюрэра СС (Sicherheitsdienst des Reichsführers SS), атрады літоўскіх і ўкраінскіх вайскоўцаў, авіячасць[88].

*Маскоўская шаша.* На 7-м і 9-м км аўтадарогі Мінск – Масква ў 1960 годзе былі пастаўлены абеліскі. На 7-м км – на магіле савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1944 годзе. На 9-м км – на месцы пахавання 30 тысяч савецкіх ваеннапалонных, партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў 1941–1944 гадах[89].

*Машэрава пр., 24, 26, 28.* У 1941–1944 гадах у будынках размяшчаўся нямецкі гарнізон – дзве тысячы чалавек[90].

*Мельнікайтэ вул.* У скверы на рагу вул. Ракаўскай і Мельнікайтэ стаіць стэла з надпісам, які сведчыць, што «на гэтым месцы ў 1941–1943 гг. нямецка-фашысцкія захопнікі стварылі гета для яўрэяў Мінска і яго ваколіц. У ім знаходзілася звыш 100 000 чалавек, у тым ліку яўрэі з многіх краін Еўропы. Амаль усе яны загінулі ў час пагромаў, былі расстраляны, спалены ў лагеры смерці Малы Трасцянец». Гета займала тэрыторыю паміж сучаснымі пр. Пераможцаў, вул. Мельнікайтэ, Сухой, Калектарнай, Рымарскай, Нямігай. У 1947 годзе у г. зв. Яме (на рагу з вул. Заслаўскай) быў пастаўлены абеліск з надпісамі на ідышы і рускай мове: «Светлая память на вечные времена пяти тысячам евреев, погибших от рук лютых врагов человечества – фашистско-немецких злодеев. 2 марта 1942 г.».

*Незалежнасці пр.* У 1941–1943 гадах, мяркуючы па здымках таго часу, паміж 1-м клінічным гарадком і будынкам АН БССР былі створаны нямецкія вайсковыя могілкі. Паводле І. Варанковай, у клінічным гарадку дзейнічаў нямецкі вайсковы шпіталь. У 1943 годзе пахаванні перанеслі на г. зв. Могілкі герояў. Могілкі салдат і афіцэраў вермахта ў 1941–1944 гадах знаходзіліся ў лесапарку ля сучаснай станцыі метро «Барысаўскі тракт» і былі вядомы пад назвамі «Могілкі герояў» (Heldenfriedhof), «Ганаровыя могілкі»

[88] *Памяць…*, с. 61.
[89] *Збор помнікаў…*, с. 157.
[90] *Памяць…*, с. 61.

(Ehrenfriedhof), «Салдацкія могілкі» (Soldatenfriedhof). У 2014 годзе Народны саюз Германіі па доглядзе за воінскімі пахаваннямі разам з Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь пачаў перапахаванне астанкаў салдат вермахта, а таксама армій саюзнікаў Германіі на зборныя могілкі ў іншых раёнах Беларусі. Да пачатку кастрычніка 2015 года рэшткі пахаванняў, якія знаходзіліся бліжэй да мікрараёна Маяк Мінска, вывезлі і перапахавалі на могілках ля г. Бярозы (Брэсцкая вобл.)[91]. Паводле некаторых звестак, на «Ганаровых могілках» быў пахаваны Г. Вёльке, чэмпіён Алімпійскіх гульняў 1936 года па штурханні ядра (заходні бок, рад 22, магіла 28)[92]. Падчас Другой сусветнай вайны Г. Вёльке служыў гаўптманам 118-га ахоўнага паліцэйскага батальёна вермахта. Быў забіты ў перастрэлцы з партызанамі недалёка ад вёскі Хатынь (цяпер у Лагойскім раёне). Гэта стала прычынай праведзенай у той жа дзень карнай аперацыі, падчас якой былі спалены жыўцом 149 мірных жыхароў Хатыні, многія з якіх – дзеці.

*Незалежнасці пр., 26.* У 1941–1944 гадах будынак займаў Менскі краёвы гістарычны музей (Landesmuseum Minsk), якім у верасні 1941 – чэрвені 1944 года кіраваў А. Шукелойць[93]. У пачатку нямецкай акупацыі музей застаўся без нагляду, быў разрабаваны, а да прыходу А. Шукелойця яго вартаваў даваенны супрацоўнік мастак Г. Віер. Таксама тут, паводле сведчання А. Шукелойця, знаходзіўся «багаты архіў», які пасля «ягоны загадчык мастак Габрыель Віер перадаў часткова духоўным уладам»[94]. У канцы жніўня 1941 года з музея ў Кёнігсберг былі вывезены «каменныя бабы», 19 гармат (16 з іх – з нясвіжскага збору Радзівілаў). У Вену была адпраўлена

---

[91] *Нямецкія вайсковыя могілкі 1941–1944 гг. пад Мінскам* [online], https://be.wikipedia.org/wiki/Нямецкія_вайсковыя_могілкі_1941-1944_гг._пад_Мінскам [доступ: 7.02.2017].

[92] *Hans Woellke* [online], https://de.wikipedia.org/wiki/Hans_Woellke [доступ: 7.02.2017].

[93] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні…*, с. 310–312.

[94] А. Шукелойць, *op. cit.*

калекцыя яўрэйскага мастацтва. 9 лістапада 1943 года музей перадаў менскім праваслаўным цэрквам культавыя рэчы, сярод якіх восем кніг XVIII–XIX стагоддзяў. 11 лістапада ў цэрквы былі аддадзены 33 прадметы: кнігі XVII–XIX стагоддзяў, абразы[95]. Музей, паводле А. Шукелойця, праводзіў «прыпадковыя розныя выстаўкі», напрыклад, прысвечаную пісьменніку К. Каганцу, выстаўляліся абразы XVI–XVII стагоддзяў віцебскай і магілёўскай школ. 1 красавіка 1944 года зборы музея ўжо накіроўваліся ў «эвакуацыю» ў горад Інстэрбург (цяпер Чарняхоўск у Калінінградскай вобласці Расіі), а 24 красавіка вагоны з каштоўнасцямі прыбылі ў замак у горадзе Гёхштэт-на-Дунаі (Баварыя)[96].

*Незалежнасці пр., 27.* Чатырохпавярховы П-падобны ў плане дом з цокальным паверхам у правай частцы быў пастаўлены ў 1940 годзе[97]. Паводле І. Варанковай, тут знаходзіўся штаб ваенна-паветраных сіл Беларускай (з 11 ліпеня 1940 года – Заходняй) асобай ваеннай акругі. У 1941–1944 гадах у будынку знаходзіўся штаб нямецкай авіяцыі[98].

*Незалежнасці пр., 43.* Да нямецкай акупацыі – жылы «дом гарсавета»[99]. Малюнак будынка быў апублікаваны ў ліпені 1943 года ў менскай нямецкай газеце „Minsker Zeitung“ як прыклад «узорнага» („vorbildliche”) «блочнага жылога дома» („Wohnhausblock”)[100].

*Незалежнасці пр., 44а.* Касцёл Найсвяцейшай Тройцы на Залатой Горцы ў 1930-я гады закрылі. Са святыні вынеслі ўсе аздобы, знішчылі арган[101]. Храм пацярпеў у час захопу Мінска немцамі ў чэрвені 1941 года, што адлюстравана на тагачасных фотаздым-

[95] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні…*, с. 310.

[96] *Ibidem*, с. 311–312.

[97] *Збор помнікаў…*, с. 128.

[98] *Памяць…*, с. 60.

[99] В. Корбут, *Минск…*, с. 56; *Збор помнікаў…*, с. 30.

[100] M. Becker, *op. cit.*

[101] *Каталіцкія святыні. Мінска-магілёўская архідыяцэзія. Ч. 1. Будслаўскі, Вілейскі і Мінскі дэканаты*, тэкст і фота А. Яроменкі, уводзіны У. Трацэўскага, Мінск 2003, с. 194.

ках. «Але, – як сведчыў А. Шукелойць, – сьцены засталіся, трымаліся, і перазімавалі зіму [1941/1942 года. – *В. К.*], ягоная столь не звалілася, а страха згарэла. Дзеля гэтага мы пайшлі агледзець гэты касьцёл з мастакамі [А. Тычынам, М. Дучыцам, М. Керзіным. – *В. К.*] і вырашылі яго закансэрваваць. Гэта значыць, зьвярнуліся адразу да прафэсара Вацлава Іваноўскага (ён тады ўжо быў старшынёй горада, гэта 1942 год), каб ён даў нам матэр'ял пакрыць касьцёл і забіць вокны, што і было зроблена. І такім парадкам касьцёл гэты закансэрвавалі. (Не аднаўлялі яго, там ніякіх службаў не было, попел у сярэдзіне ляжаў.)»[102]. Пасля 1944 года храм прыстасавалі пад кнігасховішча Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна.

*Незалежнасці пр., 49.* Будынак «Інстытута фізічнай культуры ў Мінску» быў пастаўлены ў 1939 годзе[103]. У лістападзе 1943 года тут знаходзіўся нямецкі вайсковы шпіталь[104].

*Незалежнасці пр., 56, 58.* Мінскі радыёзавод імя В. М. Молатава пачаў працу 6 лістапада 1940 года[105]. Захаваліся карпусы на пр. Незалежнасці, 56, 58 з датай на фасадзе «1940». Як прыгадваў былы супрацоўнік прадпрыемства В. Пумпянскі, «в июне сорок первого Минск очень сильно бомбили, но на завод не упало ни одной бомбы. Мы дежурили в цехах, но потом нам сказали: „Ребята, идите домой, к семьям. Правительства в Минске уже нет. Говорить не с кем". Обладая определенным опытом, мы могли бы за три дня вывезти весь завод: к цехам подходила железнодорожная ветка. […] Предложили этот вариант директору Давиду Львовичу Юделевичу. […] Тот сел за телефон, но никого нигде из руководства найти не смог. И мы

---

[102] З. Пазьняк, *op. cit.*, с. 65.

[103] *Усебеларуская выстаўка выяўленчага мастацтва «Ленін і Сталін арганізатары БССР». Жывапіс. Графіка. Скульптура. Архітэктура*, Мінск 1940, с. 181; *Збор помнікаў…*, с. 30.

[104] *Памяць…*, с. 228.

[105] В. Корбут, *Ламповые скелеты в шкафу*, «Советская Белоруссия» 2016, 9 января.

уехали, оставив этот прекрасный завод немцам»[106]. У 1941–1944 гадах радыёапараты выпускалі пад маркай Radiofabrik Minsk. На прадпрыемстве было створана гета (многія працаўнікі завода былі яўрэямі)[107]. Адступаючы з Менска, немцы 1 ліпеня 1944 года ўзарвалі значную частку прадпрыемства[108]. Аднак у ліпені прадпрыемства аднавіла працу[109].

*Незалежнасці пр., 66, 68.* Галоўны карпус Акадэміі навук БССР, як сведчаць фотаздымкі пачатку нямецкай акупацыі, быў у той час у рыштаваннях. Паводле А. Шукелойця, «у будынках Акадэміі навук БССР знаходзіліся, апрача сваіх багатых архіваў, два архівы, прывезеныя з Заходняй Беларусі: Віленскі гістарычны архіў і Радзівілаўскі архіў зь Нясьвіжу»[110]. (19 снежня 1939 года СНК БССР прыняў пастанову «Аб размяшчэнні архіва, якія прыбыў з г. Вільня», паводле якой дакументы мусілі захоўвацца ў будынку АН БССР. 16 ліпеня 1940 года на пасяджэнні ЦК КП(б)Б канстатавалася, што архіў знаходзіўся ў хаатычным стане.) Немцы, вызваляючы патрэбныя ім памяшканні ў правым крыле галоўнага корпуса АН БССР, выкінулі частку дакументаў на двор. Увесну 1942 года з Вільні прыехалі архівісты, якія разам з менскімі калегамі разабралі архіў, што праз некалькі месяцаў быў вернуты ў Вільню[111]. Нясвіжскі архіў з будынка АН БССР быў перавезены ў падвал кафедральнага касцёла, а потым – у Германію[112] (пазней вернуты ў Мінск). На 1 мая 1943 года ў будынку АН БССР размяшчаліся нямецкія штаб фронту і шпіталь[113].

---

[106] *«Еврейская» история одного белорусского завода* [online], https://jewishfreedom.jimdo.com/вениамин-пумпянский/ [доступ: 14.01.2017].

[107] В. Корбут, *Ламповые скелеты…*

[108] И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 311.

[109] В. Корбут, *Ламповые скелеты…*

[110] А. Шукелойць, *op. cit.*

[111] *Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Мінска. У 4 кн. Кн. 3*, Мінск 2004, с. 221–223.

[112] А. Шукелойць, *op. cit.*

[113] *Памяць... Кн. 4*, с. 60.

*Незалежнасці пр., 79 / Сурганава вул., 19.* У маі 1942 года ў Доме друку быў набраны першы нумар падпольнай газеты «Звязда», пра што сведчыць мемарыяльная дошка (устаноўлена ў 1972 годзе, абноўлена ў 1986-м)[114]. 3 ліпеня 1944 года сапёры выявілі ў будынку выбуховыя прыстасаванні[115].

*Няміга вул., 30.* Будынак клуба Менскай абутковай фабрыкі імя Л. М. Кагановіча быў пастаўлены ў 1930-я гады. На галоўным фасадзе змешчана мемарыяльная дошка з надпісам: «На этой фабрике в годы Великой Отечественной войны бесстрашно боролись против фашистских захватчиков советские патриоты-подпольщики».

*Парк імя Чалюскінцаў.* У паўночна-ўсходняй частцы парку імя Чалюскінцаў пахавана больш за 10 тысяч ваеннапалонных, якіх у студзені 1942 года расстралялі нямецкія захопнікі. Сярод пахаваных мірныя жыхары, падпольшчыкі, якіх акупанты загубілі ў 1941–1944 гадах. У 1945 года на магіле быў пастаўлены помнік – скульптура жанчыны ў жалобе[116].

*Парыжскай Камуны пл., 1.* У былым Беларускім дзяржаўным Вялікім тэатры оперы і балета ўвосень 1942 года аддзел мастацтваў Беларускай народнай самапомачы арганізаваў Другую мастацкую выстаўку. Былі вылучаны шэсць секцый: жывапісу, графікі, скульптуры, народнай мастацкай творчасці, мастацкага фота, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва[117]. Адкрыццё выстаўкі было прызначана на 11 кастрычніка. 22 прафесійныя мастакі, тры аматары, сем вышывальшчыц з Менска і тры мастакі з іншых гарадоў прадставілі 292 творы[118]. Будынак па-святочнаму ўбралі беларускімі і нямецкімі сцягамі. На ўрачыстасць прыбылі генеральны камісар Беларусі В. Кубэ, камісар Менска Янэцке, камісар Менскай акругі Кайзер, іншыя

---

[114] *Збор помнікаў…*, с. 121, 138.

[115] И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 319.

[116] *Збор помнікаў…*, с. 143.

[117] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 370, воп. 1, спр. 423, а. 31.

[118] М. Б., *Другая мастацкая выстаўка*, «Беларуская Газэта» 1942, 11 кастрычніка.

цывільныя і вайсковыя чыноўнікі[119]. Выстаўка размясцілася ў пяці пакоях. Эцюды, у якіх выявілася «вялікае замілаваньне мастака да абразкоў беларускае прыроды, дасканальнае майстроўства адлюстроўваць на палатне настроі гэтае прыроды», прадставіў М. Дучыц («Гарадскі сад увесну», «Вечар», «Хвоі», «Ля рэчкі»). Выстаўляліся творы І. Гембіцкага («Разбуджаны мэтлік», «Елачкі», «Сцежка», «Пахмурны дзень»). Палатно, прысвечанае Менску, стварыў А. Карджанеўскі. «Лепшы наш партрэтысты» В. Волкаў прадставіў на палатне постаць Кастуся Каліноўскага. Удалымі ў тагачаснай прэсе называліся работы А. Волкава, М. Гусева. «Моцнае ўражаньне» пакінулі пейзажы Я. Ціхановіча («Возера ў Клінку», «Лясы ў Волме», «Зіма», «Раніца ў лесе»), яго ж графічная работа «Партрэт старога». Г. Віер адзначыўся карцінай «Гістарычны музей». Сярод іншагародніх у выстаўцы ўдзельнічалі М. Сеўрук («Партрэт старога», «Кудзельніца»), А. Шымановіч (эцюд «Стары»), Кірышчэня (эцюд «Кветкі»). Мастак-аматар Лубнеўскі выставіў замалёўку «Касцёл і вежа»[120]. У 1941–1944 гадах інтэр'ер тэатра быў пашкоджаны, прадметы рэквізіту, дэкарацыі, карціны, мэбля знішчаны або вывезены ў Германію. Пры адступленні з горада немцы замініравалі будынак. Сапёры выявілі 200 авіябомб па 100 кг кожная, 1 «сюрпрыз», 50 запальных бомб[121]. Падчас разміціравання знайшлі шмат фугасаў. Немцы разлічвалі на выбух ад пажару: сапёры знайшлі схаваны ў сцяне шнур ад дэтанатара, які быў прымацаваны да духавога інструмента[122]. Аднаўленне тэатра працягвалася да 1948 года[123].

*Ракаўская вул., 24.* У 1941–1944 гадах у будынку знаходзіўся Soldatenheim der Wehrmachtortskommandatur Minsk (салдацкі

---

[119] Ул. К., *Мастацтва народу (на адкрыцьці 2-ое мастацкае выстаўкі ў Менску)*, «Беларуская Газэта» 1942, 15 кастрычніка.

[120] М. Б., *Перамога мастацтва*, «Беларуская Газэта» 1942, 6 лістапада.

[121] Г. Шостак, *Театр оперы и балета «...зерно будущего и плевелы настоящего»* [online], https://ais.by/story/2292 [доступ: 15.02.2017] .

[122] В. Кірычэнка, *op. cit.*, с. 6.

[123] *Ibidem*, с. 21.

дом Менскай гарнізоннай камендатуры вермахта) з кінатэатрам. У снежні 1944 – 1961 годзе тут знаходзіўся кінатэатр «Беларусь»[124].

*Ракаўская вул., 4.* У 1933 годзе тагачасны Кацярынінскі сабор быў закрыты, прыстасаваны пад склад, унутраная прастора падзелена на тры паверхі[125]. 7 снежня 1941 года аднавіліся богаслужэнні. У адкрыцці храма ўдзельнічаў вікарый Менскай епархіі Ф. Нарко: галоўны прастол быў асвячоны ў гонар святых апосталаў Пятра і Паўла. Службы працягваліся да канца 1944 года[126]. Падчас нямецкай акупацыі тут знаходзіўся абраз Маці Божай Менскай, адрэстаўрыраваны ў 1941–1942 гадах мастаком Г. Віерам[127]. Г. Віер стварыў новы іканастас[128]. У царкве ў гэты час служыў І. Балай: паводле А. Шукелойця, «вельмі стары чалавек, йшчэ з царскай школы, вельмі добры прамоўца», у якога сакратаром быў святар В. Баравы[129]. Пасля 3 студзеня 1945 года, калі быў арыштаваны настаяцель храма протаіерэй А. Вернікоўскі, богаслужэнні тут спыніліся[130].

*Савецкая вул.* Са жніўня 1941 года член Камароўскай падпольнай групы КП(б)Б У. Амельянюк распаўсюджваў лістоўкі супраць нямецкіх акупантаў. З пачатку мая 1942 года з'яўляўся загадчыкам аддзела агітацыі і прапаганды Менскага падпольнага гаркама КП(б)Б, рэдактарам першага нумара падпольнай газеты «Звязда». Загінуў 26 мая 1942 года. У 1980 годзе на месцы гібелі, каля касцёла Святых Сымона і Алены, быў устаноўлены мемарыяльны знак з граніту і бронзы[131].

---

[124] А. Лычавко, *Снесенные, сгоревшие, перестроенные и сохранившиеся. Все кинотеатры Минска с 1900 года до наших дней* [online], https://news.tut.by/culture/387029.html [доступ: 24.02.2017].

[125] *Церкви и приходы…*, с. 36.

[126] *Ibidem*, с. 25, 36–37.

[127] З. Пазьняк, *op. cit.*, с. 61; *Церкви и приходы…*, с. 37.

[128] А. Шукелойць, *op. cit.*

[129] З. Пазьняк, *op. cit.*, с. 105.

[130] *Церкви и приходы…*, с. 37.

[131] *Збор помнікаў…*, с. 116–117.

*Савецкая вул. / Незалежнасці пл.* 7 лістапада 1933 года перад Домам Урада быў адкрыты помнік У. Леніну і плошча перад ім атрымала імя Леніна. Не пазней за 14–16 жніўня 1941 года фігура Леніна была скінута з пастамента[132]. Пастамент захаваўся. У кастрычніку 1944 – красавіку 1945 года фігура Леніна была адноўлена на ленінградскім заводзе мастацкага ліцця «Монумент-скульптура»[133]. Фігуру У. Леніна ўстанавілі на пастаменце к 1 мая 1945 года[134].

*Савецкая вул., 11.* Раніцай 24 чэрвеня 1941 года нямецкая бомба трапіла ў левае крыло Дома Урада, пасля чаго адсюль сышлі супрацоўнікі Савета Народных Камісараў, Вярхоўнага Савета БССР. А 23.30 са Сляпянкі, дзе ў той час размясціўся СНК, у Дом Урада выехалі, атрымаўшы загад эвакуіраваць архівы, намеснікі Старшыні СНК І. Крупеня, В. Гайсін, А. Шаўроў і сакратар СНК па абарончых пытаннях І. Куцейнікаў, аднак яны не здолелі вывезці дакументы, якія трапілі ў рукі немцаў[135]. У 1941–1944 гадах немцы называлі будынак Hochhaus («Высокі дом»). Як сведчаць надпісы, зафіксаваныя на фотаздымках над уваходам у левае крыло будынка, у нямецкую акупацыю тут знаходзіліся Галоўная дырэкцыя чыгункі – Цэнтр (Haupteisenbahndirektion – Mitte), менскае аддзяленне Дырэкцыі транспарту Рэйха (Reichsverkehrsdirektion – Minsk). На іншым здымку над галоўным уваходам відаць шыльда з надпісам Deutsche Dienstpost. Ostland. Dienstpostamt Minsk («Нямецкая паштовая служба. Остланд. Менскі службовы паштамт»). 3 ліпеня 1944 года а 3.00 раніцы заданне размініраваць Дом Урада атрымаў сапёр А. Кузняцоў. Кароткімі перабежкамі з ускраіны горада байцы дасягнулі будынка. Не кранаючы рукамі дзвярэй, цягнучы

[132] *Визит Генриха Гиммлера в Минск глазами личного фотографа Адольфа Гитлера* [online], https://news.tut.by/society/397482.html [доступ: 24.02.2017].

[133] С. Крапивин, *Дом правительства: люди, легенды, годы. 80 лет назад в Минске были открыты Дом правительства и памятник Ленину* [online], http://news.tut.by/society/373719.html [доступ: 8.11.2016].

[134] В. Кірычэнка, *op. cit.*, с. 179.

[135] И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 175, 184–186.

іх вяроўкамі, каб не нарвацца на «сюрпрызы» (падрыўныя прыстасаванні, якія мацаваліся тонкімі непрыкметнымі правадкамі да клямак, фортак), сапёры ўвайшлі ў вестыбюль і пачалі абследаваць будынак. Апоўдні праца была скончана. У падвалах і вестыбюлі было выяўлена да 200 авіябомб вагою па 250 кг кожная[136], больш за 50 фугасаў вагой ад 200 да 500 кг[137]. З будынка вынеслі 1950 кг выбухоўкі, 184 бомбы вагою па 100 кг, 14 скрынь ручных гранат[138]. Паводле А. Кузняцова, 3 ліпеня пасля 12.00 адзін з салдат збіў з фасада Дома Урада свастыку, «якая закрывала герб Беларусі»[139].

*Савецкая вул., 15.* У касцёле Святых Сымона і Алены ў 1941–1942 гадах служыў ксёндз С. Глякоўскі, у 1942–1944-м З. Ігнатавічус[140]. С. Глякоўскі запрасіў у 1941 годзе з Вільні мастака П. Сергіевіча для аздаблення інтэр'ераў (у 1942-м ён аднавіў вялікі абраз Божай Маці). Над рэстаўрацыяй будынка таксама працавалі мастакі А. Тычына, М. Дучыц, М. Керзін пад кіраўніцтвам А. Шукелойця[141]. 22 чэрвеня 1943 года ў Менскім гарадскім тэатры падчас тэракта загінулі некалькі сяброў Саюза беларускай моладзі, сярод якіх Яраслаў Кушаль – сын паэтэсы Наталлі Арсенневай і вайскоўца Францішка Кушаля[142]. Як успамінаў Аляксандр Станюта, яго «стрыечная сястра з сяброўкамі была на адпяванні Яраслава ў „чырвоным" цагляным касцёле, – яны добра яго ведалі, вадзілі з ім адну кампанію»[143].

*Савецкая вул., 18.* Галоўны корпус Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта быў узведзены ў 1931 годзе[144]. Паводле прапановы СНК БССР на пасяджэнні Бюро ЦК КП(б)Б 14 кастрычніка 1939

---

[136] *Ibidem*, с. 318–319.

[137] В. Кірычэнка, *op. cit.*, с. 6.

[138] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні…*, с. 302.

[139] *Памяць… Кн. 4*, с. 283.

[140] *Касцёл Святога Сымона і Святой Алены* [online], http://chyrvony.by/historyja/parafija/49-kasciol [доступ: 27.07.2016].

[141] З. Пазьняк, *op. cit.*, с. 61, 63–64.

[142] М. Бакун, *op. cit.*

[143] А. Станюта, *op. cit.*, с. 104.

[144] *Збор помнікаў…*, с. 115.

года было вырашана ў будынку размясціць штаб Беларускага фронту Беларускай асобай ваеннай акругі. 11 ліпеня 1940 года ваенная акруга была перайменавана ў Заходнюю. 24 чэрвеня 1941 года ў будынак папала нямецкая бомба. Адсюль не былі вывезены справы каманднага і начальніцкага саставу Заходняй асобай ваеннай акругі, многія з якіх трапілі ў рукі немцаў[145].

*Сацыялістычная вул.* Паводле І. Варанковай, у 1942 годзе немцы пабудавалі аўтарамонтны завод[146]. Паводле некаторых звестак, прадпрыемства вырасла на базе 17 рамонтных павільёнаў 26-й танкавай дывізіі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Прадпрыемства належала фірме Daimler-Benz і абслугоўвала вермахт. Сумесна з Арганізацыяй Тодта было ўзведзена больш за 30 рамонтных павільёнаў. Падчас будаўніцтва выкарыстоўвалася прымусовая праца ваеннапалонных і мясцовых жыхароў. Тут працавалі больш за пяць тысяч рабочых[147]. Прадпрыемства лічылася найбуйнейшым на тэрыторыі Рэйхскамісарыята Остланд. Адступаючы з Менска ў канцы чэрвеня 1944 года, немцы не здолелі эвакуіраваць абсталяванне завода, бо бракавала вагонаў[148]. Карпусы ваеннага часу дагэтуль захаваліся на тэрыторыі Мінскага аўтамабільнага завода з боку вул. Сацыялістычнай. Пасля 1944 года тут быў створаны Мінскі аўтамабільны завод[149].

*Свабоды пл., 23.* У верасні 1941 – улетку 1943 года будынак з’яўляўся рэзідэнцыяй генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ, як сведчаць фотаздымкі таго часу з выявай шыльды на галоўным фасадзе дома з надпісам Generalkomissar für Weissruthenien. Генеральны камісарыят знаходзіўся на трэцім паверсе. На другім размяшчаліся дапаможныя службы, кухня, рэстаран для старшых

---

[145] И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 176, 187.

[146] *Ibidem*, с. 29.

[147] *Bacian.livejournal.com* [online], http://bacian.livejournal.com/94953.html [доступ: 15.01.2016].

[148] И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 306.

[149] *Bacian.livejournal.com* [online], http://bacian.livejournal.com/94953.html [доступ: 15.01.2016].

афіцэраў і гасцей, на першым – гаспадарчыя службы, кухня і рэстаран для малодшых афіцэраў і іншых наведвальнікаў[150]. Паводле А. Шукелойця, у 1941 годзе сюды з былой Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР было перавезена шмат твораў мастацтва, якія «яшчэ доўга былі складзеныя ў калідоры генэральнага камісарыяту на пляцы Волі. Урэшце й яны былі вывезеныя ў мястэка Гэгштат над Дунаем у Баварыі»[151].

*Свабоды пл., 9.* Кафедральны касцёл Імя Найсвяцейшай Панны Марыі ў 1934 годзе, пасля арышту ксяндза А. Пучкара-Хмялеўскага, быў закрыты. Пасля 1939 года будынак, паводле некаторых звестак, часам адкрывалі для набажэнстваў і правядзення абрадаў шлюбу і хрышчэння[152]. У пачатку нямецкай акупацыі храм быў вернуты вернікам[153]. Паводле ўспамінаў жыхаркі Мінска Зоф'і Сакалоўскай, запісаных у 2001 годзе, у 1941 годзе касцёл асвяціў ксёндз В. Гадлеўскі. На цырымоніі прысутнічаў бурмістр Менска В. Іваноўскі[154]. Паводле А. Шукелойця, «першую каталіцкую службу ў акупаваным Менску ў Катэдральным касьцёле адслужыў нямецкі капэлян з вэрмахту. За бальшавікамі ў гэтым касьцёле быў гараж, і нямецкія жаўнеры разам з тутэйшымі каталікамі мусілі цяжка папрацаваць, каб прывесьці сьвятыню да годнага выгляду. Алтарная сьцяна складалася з прынесенага з тэатру вялікага кавалку дэкарацыйнага палатна з узорамі народнай дзяружкі чорна-жоўтага колеру ды расьпяцьця з музэйнага складу»[155]. Камісія на чале з А. Шукелойцем (сябры камісіі мастакі А. Тычына, М. Дучыц, скульптар М. Керзін) абследавала храм. Паводле А. Шукелойця, «там вельмі цікавы росьпіс быў, з ранейшых часоў. Там, напрыклад, былі розныя абразы, такія

---

[150] О. Усачев, *op. cit.*

[151] А. Шукелойць, *op. cit.*

[152] С. Адамовіч, *Цуд адраджэння*, «Наша вера» 1998, № 1, с. 16.

[153] *Ibidem*, с. 16–17.

[154] *Святло Чырвонага касцёла. Да стагоддзя Касцёла Святога Сымона і Святой Алены*, укл. У. Завальнюк, А. Сакалоўская, Мінск 2015, с. 128.

[155] А. Шукелойць, *op. cit.*

калёны намаляваныя, што яны не супадалі з калёнамі касьцёлу. […] Мы сабраліся ў гэтым касьцёле, агледзелі яго. Трэба было касьцёл аднаўляць, але мастакі тады парадзілі, што няхай усё застаецца так, як ёсьць. Скончыцца вайна, тады прыедуць сюды і сьвятары, і будуць мастакі-спэцыялісты, якія вырашаць, што з гэтым росьпісам рабіць. А пакуль што – мы ўстрымаемся нешта рабіць. Айцец Гляkоўскі даў Сергіевічу ў гэтым Катэдральным саборы расьпісаць зь левага боку аўтар левай навы»[156]. 29 чэрвеня 1944 года ў Менск прыехаў ксёндз В. Шутовіч, які стаў пробашчам кафедральнага касцёла, але пасля яго арышту 26 студзеня 1945 года[157] храм быў закрыты.

*Свярдлова вул., 15.* Паводле ўспамінаў Рагнеды (Ірыны) Рамаlоўскай, дачкі Кузьмы Чорнага, «у панядзелак, 23 чэрвеня, бацькі паслалі мяне па хлеб. Магазін быў побач з маёй школай [№ 20, на сучаснай вул. Свярдлова, 17. – *В. К.*] […]. І раптам завылі сірэны: паветраная трывога»[158].

*Свярдлова вул., 17.* Паводле І. Варанковай і Р. Раманоўскай, да 1941 года тут знаходзілася беларуская «сталінская школа» № 20[159]. Гл. вышэй. Паводле Р. Раманоўскай, «у школьным двары побач з нейкімі дзядзькамі я перасед зела тую трывогу. Пасля адбою пабегла дадому»[160].

*Свярдлова вул., 2.* Як сведчаць фотаздымкі 1941–1944 гадоў, у той час будынак фабрыкі-кухні быў прыстасаваны пад гатэль «Нямецкі дом»: надпіс Hotel Deutsches Haus быў змешчаны наверсе барабана ўваходнай групы, пад гэтай жа назвай дом фігуруе на карце 1943 года.

*Слясарная вул., 41.* Хлебазавод-аўтамат быў уведзены ў эксплуатацыю ў 1940 годзе[161]. У 1941–1944 гадах (Brotfabrik Automat)

[156] З. Пазьняк, *op. cit.*, с. 64–65.

[157] Л. Маракоў, *Галоўная вуліца Мінска (1880–1940 гг.). Кн. 1*, Мінск 2012, с. 59.

[158] *Кузьма Чорны. Чалавек – гэта цэлы свет: успаміны, эсэ, артыкулы, інтэрв'ю, дакументы*, уклад. Г. Шаблінская, Мінск 2016, с. 40.

[159] *Ibidem*, с. 44.

[160] *Ibidem*, с. 40.

[161] *Хлебозавод «Автомат»* [online], http://www.minskhleb.com/enterprise/factories/avtomat/ [доступ: 14.01.2017].

дзейнічаў. 3 ліпеня 1944 года сапёры выявілі ў будынку выбуховыя прыстасаванні[162]. Прадпрыемства аднаўлялі да 1947 года[163]. На будынку змешчана мемарыяльная дошка пра дзейнасць на заводзе ў 1942–1944 гадах падпольнай групы пад кіраўніцтвам Менскага падпольнага гаркама КП(б)Б.

*Сухая вул.* На тэрыторыі былых яўрэйскіх могілак цяпер знаходзіцца мемарыяльны сквер, дзе сабраны ацалелыя надмагільныя помнікі як з гэтых могілак, так і з месцаў пахаванняў яўрэяў у іншых раёнах Мінска. Побач усталяваны стэлы ў памяць пра знішчаных у Менскім гета яўрэяў з нямецкіх гарадоў Бона, Брэмена, Гамбурга, Дзюсельдорфа, Кёльна, чэшскіх гарадоў Брно і Тэрэзін. Увосень 2008 года, у 65-ю гадавіну знішчэння Менскага гета, тут была пастаўлена скульптурная кампазіцыя «Разбіты ачаг» з надпісам: «На гэтым месцы ў 1941–1943 гг. фашыстамі і іх пасобнікамі было знішчана звыш 5000 яўрэяў. Вечная памяць бязвінным ахвярам нацызму».

*Сяліцкага вул.* 22 чэрвеня 2015 года адбылося адкрыццё мемарыяльнага комплексу «Трасцянец», увянчанага кампазіцыяй «Брама памяці». Назва «Трасцянец» аб’ядноўвае некалькі месцаў масавага знішчэння людзей пад Менскам у 1941–1944 гадах: урочышча Благаўшчына – месца масавых расстрэлаў, уласна лагер побач з вёскай Малы Трасцянец (цяпер у межах Мінска ўздоўж вул. Сяліцкага), урочышча Шашкоўка – месца масавага спальвання людзей. Да 1941 года на гэтай тэрыторыі існаваў калгас імя Карла Маркса. У пачатку 1942 года ў ваколіцах вёскі Малы Трасцянец на 200 га ўгоддзяў былога калгаса немцы стварылі працоўны лагер, агароджаны калючым дротам пад электрычным токам[164]. Восенню 1941 года ўрочышча Благаўшчына на 11-м кіламетры Магілёўскай шашы, за паўтара кіламетра ад вёскі Малы Трасцянец, было абрана акупан-

---

[162] И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 319.

[163] *Хлебозавод «Автомат»*.

[164] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні…*, с. 317, 323.

тамі ў якасці месца знішчэння людзей. Расстрэльвалі ў загадзя падрыхтаваных доўгіх равах, трупы закопвалі і ўтрамбоўвалі гусенічным трактарам. Ахвярамі расстрэлаў былі пераважна яўрэі. Першы эшалон яўрэяў прыбыў з Гамбурга 10 лістапада 1941 года. Восенню 1943 года гітлераўцы пачалі знішчаць сляды сваіх злачынстваў. У лістападзе-снежні 1943 года былі раскапаны і спалены каля ста тысяч трупаў расстраляных ў Благаўшчыне. У канцы чэрвеня 1944 года на тэрыторыі лагера, у былым калгасным хляве былі расстраляны, а затым спалены 6,5 тысяч вязняў, прывезеных з турмы на вул. Валадарскага і з лагера на вул. Шырокай[165].

*Талбухіна бульвар.* На сучасным бульвары Талбухіна пахаваны 10 тысяч чалавек, большасць – ваеннапалонныя, а таксама мірныя грамадзяне, закатаваныя або расстраляныя нямецкімі захопнікамі ў 1941–1944 гадах, савецкія воіны і партызаны. У 1963 годзе на магіле была ўстаноўлена гранітная пліта. Злева ад брацкай магілы ў 1987 годзе паставілі валун на ўшанаванне воінаў 4-й гвардзейскай Мінскай Чырванасцяжнай ордэна Суворава II ступені танкавай брыгады 2-га гвардзейскага Тацынскага Чырванасцяжнага ордэна Суворава II ступені танкавага корпуса, якія загінулі тут 3 ліпеня 1944 года[166].

*Трасцянецкая вул., 5а.* У 1930 годзе ў двухпавярховым будынку былой фабрыкі цацак «Адраджэнне» была створана швейная фабрыка імя Н. К. Крупскай. У 1941–1944 гадах тут шылі бялізну і парашуты для вермахта[167]. На будынку на вул. Трасцянецкай, 5 у 1960 годзе была ўстаноўлена мемарыяльная дошка з надпісам: «На этой фабрике в годы Великой Отечественной войны бесстрашно боролись против фашистских оккупантов советские патриоты-подпольщики». Падполле дзейнічала з лютага 1942 да ліпеня 1944 года[168].

[165] *Ibidem*, с. 316–318.
[166] *Збор помнікаў…*, с. 203.
[167] И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 29.
[168] *Збор помнікаў…*, с. 204.

*Фабрыцыуса вул., 30.* Хімічна-фармацэўтычны завод Белмедгандлю адкрыўся 8 лістапада 1929 года. У чэрвені 1941 года прадпрыемства не змаглі эвакуіраваць, паспелі толькі падпаліць склады з гатовай прадукцыяй і сыравінай і вывесці са строю абсталяванне. Немцы, аднак, запусцілі бінтарэзны, мазевы і галенавы цэхі, але аднавіць вытворчасць медыкаментаў не ўдалося. Працаўнікі, якія далучыліся да антынямецкага падполля, выводзілі са строю абсталяванне, падпальвалі склады з сыравінай і лекамі. Сярод актывістаў падполля былі П. Асядоўскі (арыштаваны і пасля катаванняў расстраляны ў лагеры смерці Трасцянец 28 чэрвеня 1944 года), А. Макарчук і В. Вяржбіцкая. Яны ўдзельнічалі ў стварэнні дзвюх падпольных груп, якія дзейнічалі з верасня 1941 да сакавіка 1944 года. Перад адступленнем з Менска ў пачатку ліпеня 1944 года немцы спалілі галоўны корпус завода. Але ў сярэдзіне 1945 года прадпрыемства было адноўлена[169].

*Ціміразева вул.* У ліпені 1941 – чэрвені 1944 года існаваў канцэнтрацыйны лагер для савецкіх ваеннапалонных і грамадзянскіх асоб (шталаг № 352; ням. *Stalag, Stammlager* «асноўны лагер»). Складаўся з дзвюх частак: «ляснога лагера» каля вёскі Масюкоўшчына і «гарадскога лагера» ў Менску ў былых Пушкінскіх казармах на сучаснай вул. Якуба Коласа (цотны бок ад вул. Калініна да Бялінскага). У 1949 годзе на месцы былога лагера каля вёскі Масюкоўшчыны быў пастаўлены манумент.

*Чарнышэўскага вул., 8, 12, Калінінградскі зав., 16, 17.* Паміж сучаснымі вул. Сурганава, Якуба Коласа, Калініна і Кузьмы Чорнага ў 1937 годзе быў узведзены Пушкінскі пасёлак, названы ў гонар рускага паэта А. С. Пушкіна (у стагоддзе яго гібелі). Паводле ўспамінаў аднаго з жыхароў пасёлка акцёра М. Шчансновіча, запісаных у 1970-я гады, нямецкая акупацыя пачалася тут у 1941

---

[169] В. Зеленков, *Минскому заводу медпрепаратов – 85 лет: здесь многое сделано впервые в СССР* [online], https://news.tut.by/society/422948.html [доступ: 14.01.2017].

годзе так: «А на рассвете поселок заняли немецкие мотоциклисты. Они стояли возле своих машин и никому не разрешали выходить из домов. Через два дня, 28 июня, весь город был занят немцами». 4 лістапада 1941 года пасёлак перайменавалі ў гонар Ф. Скарыны – Skoryna Siedlung. 17 красавіка 1942 года ў перастрэлцы з немцамі тут загінуў А. Макаранка і быў смяротна паранены В. Жудро – удзельнікі антынямецкага падполля. У пасёлку была апошняя кватэра падпольшчыка Жана (І. Кабушкіна), які адсюль 4 лютага 1943 года адправіўся на сустрэчу, дзе быў схоплены немцамі. У пасёлку жыў А. Шукелойць. У канцы верасня 1943 года немцы загадалі жыхарам вызваліць дамы для размяшчэння ў іх вайсковых часцей. М. Шчансновіч прыгадваў: «Немцы объявили, что все жители Пушкинского поселка должны срочно освободить весь район, а кто этого не сделает, тех будут выселять из занимаемых квартир прямо на улицу. Указан был срок. Поселок пришел в движение. Все начали искать себе комнаты на соседних улицах». М. Шчансновіч 2 кастрычніка 1943 года накіраваўся да партызан. У разведвальных зводках, якія паступалі з пасёлка ў маскоўскі Беларускі штаб партызанскага руху, гаварылася пра размешчаныя тут вайсковыя часці, батарэі зенітных гармат, агнявыя пункты немцаў. Паводле зводкі, што захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, «в лесу, за городом, по левой стороне Московского шоссе, если итти из Минска в Борисов, Пушкинский городок, где раньше была киностудия – стоит каждый день много автомашин, охраняют немцы». У 1944 годзе савецкая авіяцыя бамбардзіравала пасёлак[170].

*Чкалава вул., 16.* Паводле некаторых звестак, у 1941–1944 гадах тут знаходзілася чыгуначнае ўпраўленне (Reichsbahnamt). На будынку ў 1961 годзе была ўстаноўлена мемарыяльная дошка з надпісам: «В этом доме в 1941–1942 гг. находилась конспиративная

[170] *Bacian.livejournal.com* [online], http://bacian.livejournal.com/93241.html [доступ: 15.01.2016].

квартира подпольной партийной организации Минского железнодорожного узла». У ліпені 1941 года тут, на кватэры Ф. Кузняцова, адбыўся першы нелегальны сход камуністаў Менскага чыгуначнага вузла. Быў створаны вузлавы партыйны камітэт, які дзейнічаў да сакавіка 1942 года, калі пачаліся масавыя арышты. Тады Ф. Кузняцоў сышоў у партызаны. У ліпені 1942 года быў створаны Чыгуначны падпольны райкам КП(б)Б, явачная кватэра якога знаходзілася ў гэтым доме (райкам існаваў да верасня, калі яго членаў арыштавалі)[171].

*Чкалава вул., 3а.* Паводле І. Варанковай, да 1941 года тут знаходзілася СШ № 18. У нямецкую акупацыю будынак займала мотамеханізаваная вайсковая часць[172].

*Чыжэўскіх вул.* Каля дома на вул. Чыжэўскіх, 40 у 1981 годзе быў пастаўлены помнік[173] з надпісам: «На гэтым месцы 25 снежня 1943 года былі павешаны фашыстамі падпольшчыцы Майсеева Надзея Пятроўна, маці і дачка Чыжэўскія – Марыя Паўлаўна і Алена Антонаўна».

*Чыжэўскіх праезд, 8, к. 2.* У былым палацы Любанскіх у Лошыцы жылі генеральныя камісары Беларусі В. Кубэ (1941–1943), К. фон Готберг (1943–1944). Будынак наведваў міністр Германскага рэйха па справах усходніх акупіраваных тэрыторый А. Розенберг. У суседніх будынках працавалі навуковыя супрацоўнікі даваеннага інстытута раслінаводства[174].

*Чырвонаармейская вул, 10.* Паводле П. Растоўцава, на нямецкіх планах 1942 года тут адзначаны Патсдамскі дом, дзе знаходзіліся нямецкія грамадзянскія ўстановы. Патсдамскі дом фігуруе ў кнізе

---

171 *Збор помнікаў…*, с. 210–211.

172 *Памяць... Кн. 4*, с. 61.

173 *Збор помнікаў…*, с. 213.

174 Г. Левина, *Словарь усадебного дома в Лошице*, «Архитектура и строительство» 2008, № 11, с. 60; С. Крапивин, *Железный периметр усадьбы Лошица* [online], http://vsr.mil.by/2012/06/08/zheleznyj-perimetr-usadby-loshica-2/ [доступ: 24.07.2016].

нямецкага пісьменніка П. Коля «Найлепшыя пажаданні з Менска», якая расказвае пра трагічны лёс яўрэяў, вывезеных у 1941 годзе з Германіі на знішчэнне ў Менск. На планах горада, якія складаліся ў канцы 1943 – пачатку 1944 года ў маскоўскім Беларускім штабе партызанскага руху, у будынку адзначана пошта.

*Чырвонаармейская вул., 3.* 23 лютага 1941 года ў Доме Чырвонай Арміі імя К. Я. Варашылава адкрыўся Тэатр Чырвонай Арміі Заходняй асобай ваеннай акругі[175]. 17 чэрвеня 1941 года а 20.00 спектаклем «На дне» тут пачаліся першыя гастролі ў Мінску акцёраў Маскоўскага мастацкага акадэмічнага тэатра імя М. Горкага (МХАТ). 21 чэрвеня а 20.00 мхатаўцы тут ставілі спектакль «Тарцюф» паводле Ж.-Б. Мальера. У тэатральнай зале знаходзіліся прадстаўнікі кіраўніцтва БССР, камандавання Заходняй асобай ваеннай акругі разам з камандуючым Дз. Паўлавым, у ложы якога быў устаноўлены апарат высокачастотнай сувязі для забеспячэння пастаяннай сувязі з войскамі акругі і Масквой. Яшчэ падчас спектакля начальнік разведкі акругі генерал-лейтэнант С. Блахін паведаміў Дз. Паўлаву пра трывожныя весткі з дзяржаўнай граніцы. А 22.00 у Доме Чырвонай Арміі адбылася вячэра. Высокія службовыя асобы пакінулі будынак 22 чэрвеня а 1.00. Артысты разышліся толькі а 4.00. У гэты момант Германія напала на СССР[176]. Нягледзячы на пачатак вайны, 23 чэрвеня адбыўся паказ спектакля «Школа зласлоўя» – апошняе выступленне трупы МХАТ. 24 чэрвеня маскоўскія артысты вярнуліся ў Дом Чырвонай Арміі, каб высветліць лёс сваёй маёмасці, але ўбачылі, што бомба разбурыла правую частку будынка, дзе захоўваліся дэкарацыі і касцюмы. У той жа дзень артысты атрымалі ад адміністрацыі Дома Чырвонай Арміі легкавы аўтамабіль, грузавік і аўтобус з невялікім запасам бензіну[177]. 24 чэрвеня ў падвалы Дома Чырвонай Арміі пераб-

[175] И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 23.

[176] *Ibidem*, с. 48, 89–90.

[177] *Ibidem*, с. 150, 166, 232.

раўся штаб Беларускага фронту Заходняй асобай ваеннай акругі. Штаб пакінуў будынак і Мінск 25 чэрвеня паміж 2.00 і 4.00[178]. У 1941–1944 гадах у левым крыле дзейнічалі нямецкі салдацкі клуб (Soldatenheim), кінатэатр, казіно, лазарэт і публічны дом для салдат і афіцэраў. У 1943 годзе тут адбылася жалобная цырымонія развітання з забітым генеральным камісарам Беларусі В. Кубэ. У правым крыле будынка, як сведчаць фотаздымкі 1941–1944 гадоў, знаходзіўся 3-і вайсковы лазарэт (Kriegslazarett III). 3 ліпеня 1944 года ў Доме Чырвонай Арміі выбухнула нявыяўленая савецкімі сапёрамі нямецкая фугасная бомба і пачаўся моцны пажар[179]. Агонь ахапіў усе тры паверхі правага крыла. У разбураным немцамі водаправодзе не было вады. Да глыбокай ночы пажарныя і салдаты-добраахвотнікі змагаліся з агнём[180]. Апоўдні 4 ліпеня ўдалося ліквідаваць пажар, пампуючы ваду з ракі Свіслачы[181].

*Чырвонаармейская вул., 9.* 6 верасня 1942 года ў будынку былой Дзяржаўнай бібліятэкі БССР, дзе тады знаходзіўся Менскі акруговы камісарыят, камісар Менскай акругі Кайзер і бурмістр Менскага раёна Контаўт адкрылі выстаўку народнага мастацтва Менскага раёна[182]. Найцікавейшымі экспанатамі, як адзначалася ў друку, былі ручнікі і паясы, аздобленыя традыцыйным беларускім арнаментам[183]. Тут можна было пабачыць вышываныя посцілкі, дываны, адзенне вяскоўцаў, ганчарныя вырабы. Экспазіцыю дапаўнялі дажыначныя вянкі, прывезеныя з Курасоўшчыны са свята заканчэння збору ўраджаю. Адзін пакой займала галерэя партрэтаў менскіх нямецкіх чыноўнікаў, выкананая мастаком Астравумавым. Дапаўнялі выстаўку малюнкі, сярод якіх былі работы

---

[178] *Ibidem*, с. 176, 252.

[179] И. Воронкова, *Минск и минчане…*, с. 471.

[180] *Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь*, склад. В. Абламскі, І. Чарняўскі, Ю. Барысюк, Мінск 2009, с. 664.

[181] *Ibidem*; И. Воронкова, *Минск: лето 1941…*, с. 327.

[182] *Пераканайцеся*, «Беларуская Газэта» 1942, 6 верасьня.

[183] Н. Багушэвіч, *Тое, што захавалася*, «Беларуская Газэта» 1942, 17 верасьня.

А. і В. Волкавых[184]. Паводле фотаздымка, на якім адлюстраваны з'езд кіраўнікоў Беларускай народнай самапомачы 1–4 лістапада 1942 года, сход адбываўся у былой чытальнай зале бібліятэкі[185]. У снежні 1943 – чэрвені 1944 года будынак займала Беларуская цэнтральная рада. На здымках, якія захаваліся з таго часу, відаць, што пасяджэнні БЦР адбываліся ў былой чытальнай зале[186]. У 1941–1944 гадах інтэр'ер бібліятэкі быў пашкоджаны, замураваны некаторыя вокны, знішчана абсталяванне, зроблена перапланіроўка. Немцы збіраліся ўзарваць будынак, але не паспелі[187]. У 1941 годзе фонд бібліятэкі складаў 2 мільёны экзэмпляраў кніг. 1 мільён 700 тысяч кніг былі страчаны ў 1941–1944 гадах. У красавіку 1944 года з былой бібліятэкі былі вывезены пад нямецкі горад Рацібор (цяпер Рацібуж у Польшчы) 17 вагонаў з 200 тысячамі тамоў. Таксама кнігі адпраўлялі ў Міславіц (цяпер Мыславіцы ў Польшчы) – 1 мільён 300 тысяч кніг, Лігніц (цяпер Лягніца ў Польшчы). У Мінск вярнуліся 600 тысяч тамоў, каля мільёна прапала бясследна, у тым ліку рукапісы, старадрукаваныя і іншыя рэдкія выданні[188].

*Энгельса вул., 26. «Урачыстае адчыненне палаца піянераў і акцябрат»* адбылося 29 верасня 1936 года[189]. Паводле Р. Раманоўскай, 21 чэрвеня 1941 года яна *«займалася ў драматычным гуртку»* палаца: «А ў тую нядзелю мы сядзелі ў пакоі і чакалі, калі пачнецца канцэрт. Нас паклікалі на пляцоўку, і мы слухалі прамову Молатава… [...] Пасля канцэрта я з сяброўкамі пайшла дадому, мы яшчэ разважалі: 24 чэрвеня ў нашым гуртку будуць заняткі ці іх адменяць? Думалі, што да Мінска вайна не дойдзе»[190]. Паводле А. Шукелойця, палац падпалілі, адступаючы з Мінска, супрацоўнікі НКУС БССР:

---

[184] *Адчыненьне выстаўкі народнага мастацтва*, «Беларуская Газэта» 1942, 13 верасьня.

[185] „Arche” 2010, № 5, с. 473.

[186] „Arche” 2008, № 5, с. 217–218.

[187] *Дзяржаўны спіс…*, с. 665.

[188] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні…*, с. 307–308.

[189] *Цудоўны палац*, «Іскры Ільіча» 1936, № 9, с. 12–13.

[190] *Кузьма Чорны…*, с. 39.

«Вядомы выпадак абароны менчукамі Палацу піянэраў. А вы што, ня думаеце вяртацца? – крычэлі падпальшчыкам жанчыны»[191]. Паводле Р. Раманоўскай, «пасля вайны […] наш клас разбіраў завалы ў глядзельнай зале Палаца піянераў»[192].

*Энгельса вул., 7.* Да нямецкай акупацыі – 1-ы Беларускі дзяржаўны тэатр. У 1941–1944 гадах у будынку дзейнічаў Менскі гарадскі тэатр. 22 чэрвеня 1943 года, у другую гадавіну нападу Германіі на СССР, які немцы называлі «днём вызвалення», у тэатры адбылася цырымонія заснавання Саюза беларускай моладзі. Падчас яе ў зале прагрымеў выбух. Загінулі Андрэй Братко, Яраслаў Кушаль, Кастусь Мокат, Тамара Насеннік, Марыя Негіна, Марыя Сабалеўская, Леанід Слаўнін і трое неапазнаных асоб[193]. А. Станюта ўспамінаў: «У той дзень, 22 жніўня, праз два гады ад пачатку вайны, у тэатры, падчас сходу мінскай моладзі з маючым пасля адбыцца спектаклем, партызаны планавалі ўзарваць мінаю гаўляйтэра Беларусі Вільгельма Кубэ. Але ён чамусьці не прысутнічаў. Ацалелыя ж пасля выбуху згадвалі, што наогул бачылі там толькі аднаго нямецкага афіцэра – той сядзеў з жанчынаю на галёрцы. А ўнізе загінула нямала маладых людзей, у тым ліку і старэйшы сын Наталлі Арсенневай – Яраслаў. Акцыю, выходзіць, не змаглі прыпыніць – і застаецца толькі спадзявацца, што менавіта адно не змаглі…»[194]. 27 чэрвеня 1944 года ў тэатры адбыўся г. зв. II Усебеларускі кангрэс, які арганізавалі нямецкія акупацыйныя ўлады і Беларуская цэнтральная рада. У з’ездзе ўдзельнічалі 1039 дэлегатаў з Беларусі, Літвы, Латвіі, Варшавы, Лодзі, Кракава, Прагі, Вены, Кёнігсберга і Берліна. Кангрэс абвясціў сябе найвышэйшым прадстаўніцтвам беларускага народа і надаў такія паўнамоцтвы БЦР на чале з Р. Астроўскім. 30 чэрвеня Рада БЦР перабралася з Менска

---

[191] А. Шукелойць, *op. cit.*

[192] *Кузьма Чорны…*, с. 42.

[193] М. Бакун, *op. cit.*

[194] А. Станюта, *op. cit.*, с. 104.

ў Кёнігсберг, а затым у Берлін, дзе прызнавалася немцамі «выключным і адзіным прадстаўніцтвам беларускага народа»[195]. У 1944 годзе, пасля вызвалення Мінска ад немцаў, як сведчыла дырэктар тэатра Фані Алер, у будынку панавалі «бруд, занядбанасць»: «Разрабана ўсё ад звычайнай лямпачкі да вялікай тэатральнай заслоны»[196].

*Якуба Коласа вул. (цотны бок ад вул. Калініна да Бялінскага).* Тры трохпавярховыя карпусы казарм па цотным баку сучаснай вул. Якуба Коласа (ад вул. Калініна да Бялінскага) былі пабудаваны да чэрвеня 1941 года для артылерыйскага палка на тэрыторыі Пушкінскага пасёлка. У ліпені 1941 – вясной 1943 года будынкі займаў канцэнтрацыйны лагер для савецкіх ваеннапалонных Puschkin-Kaserne. У шпіталі лагера памерлі 10 тысяч палонных. Яны пахаваны за будынкамі казарм у брацкіх магілах. Уся тэрыторыя лагера была абгароджана плотам з калючага дроту, праз кожныя 100 м стаялі вышкі. Увесну 1943 года рэшту палонных перавялі ў лагер у Масюкоўшчыне. У Пушкінскіх казармах размясцілі дзве роты 11-га паліцэйскага батальёна. Паліцэйскія ўдзельнічалі ў ачапленні месцаў расстрэлаў яўрэяў, публічных пакараннях смерцю менскіх падпольшчыкаў[197]. У скверы на рагу вул. Якуба Коласа і Калініна ўстаноўлена стэла з надпісам: «На гэтым месцы ў 1941–1943 гг. знаходзіўся фашысцкі лагер для савецкіх ваеннапалонных – гарадская частка лагера „Шталаг-352” (Масюкоўшчына), у якім знаходзіліся да 140 000 ваенных і цывільных палонных, значная частка якіх загінула». У 2011–2012 гадах тут паставілі скульптурную кампазіцыю з фігураю расстралянага палоннага.

---

[195] Ю. Туронак, *op. cit.*, с. 659, 667.

[196] О. Кукуня, Л. Иванова, *Наш театр*, «Архитектура и строительство» 2010, № 5, с. 29.

[197] О. Усачев, *Лагерь военнопленных в Пушкинских казармах, часть 1* [online], http://minsk-old-new.com/minsk-3309-ru.htm [доступ: 15.01.2017].

## Архіўныя крыніцы

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 370, воп. 1, спр. 423, арк. 31.

## Літаратура

„Arche" 2008, № 5.

„Arche" 2010, № 5.

*Bacian.livejournal.com* [online], http://bacian.livejournal.com/63821.html [доступ: 15.01.2016].

*Bacian.livejournal.com* [online], http://bacian.livejournal.com/93241.html [доступ: 15.01.2016].

*Bacian.livejournal.com* [online], http://bacian.livejournal.com/94953.html [доступ: 15.01.2016].

Becker M., *Sowjet-Architektur. Wohnungsbau und Wohnungsfürsorge der Bolschewisten in Minsk*, „Minsker Zeitung" 1943, 11.Juli.

*Hans Woellke* [online], https://de.wikipedia.org/wiki/Hans_Woellke [доступ: 7.02.2017].

„Minsker Zeitung" 1944, 22. Juni.

*Nasze Kościoły. Djecezja Mińska*. T. 2. Zesz. 11. Red. J. Żyskar, Warszawa 1913.

Адамовіч С., *Цуд адраджэння*, «Наша вера» 1998, № 1.

*Адчыненьне выстаўкі народнага мастацтва*, «Беларуская Газэта» 1942, 13 верасьня.

Багушэвіч Н., *Тое, што захавалася*, «Беларуская Газэта» 1942, 17 верасьня.

Бакун М., *Паховіны ахвяраў бальшавіцкага тэрору*, «Беларуская Газэта» 1943, 30 чырвеня.

*Белорусский производственно-торговый концерн лесной, деревообрабатывающей и целлюлозно-бумажной промышленности* [online], http://bellesbumprom.by/ru/o-kontserne/istoriya [доступ: 7.01.2017].

*Визит Генриха Гиммлера в Минск глазами личного фотографа Адольфа Гитлера* [online], https://news.tut.by/society/397482.html [доступ: 24.02.2017].

Воронков Ю., *Памятники В. И. Ленину в Белоруссии*, Минск 1976.

Воронкова И., *Минск и минчане в 1941 г. (по материалам фондов Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны)* [у:] *Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі. Крыніцы па гісторыі горада. Сацыяльныя структуры і паўсядзённасць: да 945-годдзя Мінска: зборнік навуковых артыкулаў*, уклад. А. Груша, рэдкал.: А. Каваленя і інш., Мінск 2012.

Воронкова И., *Минск: лето 1941, лето 1944,* Минск 2014.

*Вы должны это знать: как создавали и кто разрушал Немигу, которая могла быть нашей «маленькой Вильней». 90 лет Старой Немиги* [online], https://citydog.by/post/minsk1067_nemiga/ [доступ: 21.01.2018].

Денисов В., Кукуня О., *Улица Лошицкая – Базарная – Подгорная – Карла Маркса* [online], https://ais.by/story/1445 [доступ: 6.01.2017].

*Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь*, склад. В. Абламскі, І. Чарняўскі, Ю. Барысюк, Мінск 2009.

Друпов А., Чернушевич А., *ДОТы – отметины времени. Немецкие фортификационные сооружения ВМВ в Минске* [online], http://www.fortressby.com/index.php?option=com_deeppockets&task=catContShow&cat=60&id=104&Itemid=5 [доступ: 15.01.2017].

*«Еврейская» история одного белорусского завода* [online], https://jewishfreedom.jimdo.com/вениамин-пумпянский/ [доступ: 14.01.2017].

Ескевіч Д., Батоева О., *Рэканструкцыя сталіцы Беларусі,* «Работніца і калгасніца Беларусі» 1941, № 10.

*Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінск*, гал. рэд. С. Марцэлеў, Мінск 1988.

Зеленков В., *Минскому заводу медпрепаратов – 85 лет: здесь многое сделано впервые в СССР* [online], https://news.tut.by/society/422948.html [доступ: 14.01.2017].

*История университетского городка* [online], http://www.bsu.by/ru/main.aspx?guid=203241 [доступ: 9.03.2017].

*Касцёл Святога Сымона і Святой Алены* [online], http://chyrvony.by/historyja/parafija/49-kasciol [доступ: 27.07.2016].

*Каталіцкія святыні. Мінска-магілёўская архідыяцэзія. Ч. 1. Будслаўскі, Вілейскі і Мінскі дэканаты*, тэкст і фота А. Яроменкі, уводзіны У. Трацэўскага, Мінск 2003.

Кірычэнка В., *Мінск. Гісторыя пасляваеннага аднаўлення. 1944–1952 гг.*, Мінск 2004.

Корбут В., *Ад Мінска да Вільні. Гісторыя Беларусі ў журналісцкіх нататках*, Мінск 2016.

Корбут В., Ласько Д., *Мінск. Спадчына сталіцы Беларусі. 1918–2018*, Мінск 2017.

Корбут В., Ласько Д., *Спадчына старога горада. 1067–1917*, Мінск 2016.

Корбут В., *Минск. Лучший вид на этот город*, Минск 2013.

Корбут В., *Дома, хранящие историю*, «Советская Белоруссия» 2014, 3 сентября.

Корбут В., *Ламповые скелеты в шкафу*, «Советская Белоруссия» 2016, 9 января.

Крапивин С., *Дом правительства: люди, легенды, годы. 80 лет назад в Минске были открыты Дом правительства и памятник Ленину* [online], http://news.tut.by/society/373719.html [доступ: 8.11.2016].

Крапивин С., *Дом у Троицкого предместья* [online], http://minsk-old-new.com/minsk-3289-ru.htm [доступ: 15.01.2017].

Крапивин С., *Железный периметр усадьбы Лошица* [online], http://vsr.mil.by/2012/06/08/zheleznyj-perimetr-usadby-loshica-2/ [доступ: 24.07.2016].

Кубэ В., *Новы бальшавіцкі тэрарыстычны акт на мірнае жыхарства Менску*, «Беларуская Газэта» 1943, № 47.

*Кузьма Чорны. Чалавек – гэта цэлы свет: успаміны, эсэ, артыкулы, інтэрв'ю, дакументы*, уклад. Г. Шаблінская, Мінск 2016.

Кукуня О., Иванова Л., *Наш театр*, «Архитектура и строительство» 2010, № 5.

Левина Г., *Словарь усадебного дома в Лошице*, «Архитектура и строительство» 2008, № 11.

«Літаратура і мастацтва» 1945, 20 мая.

Літвін А., *Акупацыя Беларусі (1941–1944): пытанні супраціву і калабарацыі*, Мінск 2000.

Лычавко А., *Снесенные, сгоревшие, перестроенные и сохранившиеся. Все кинотеатры Минска с 1900 года до наших дней* [online], https://news.tut.by/culture/387029.html [доступ: 24.02.2017].

М. Б., *Другая мастацкая выстаўка*, «Беларуская Газэта» 1942, 11 кастрычніка.

М. Б., *Перамога мастацтва*, «Беларуская Газэта» 1942, 6 лістапада.

Меракоў Л., *Галоўная вуліца Мінска (1880–1940 гг.). Кн. 1*, Мінск 2012.

*Минск-1 (аэропорт)* [online], https://ru.wikipedia.org/wiki/Минск-1_(аэропорт), [доступ: 8.01.2017].

*Минская ТЭЦ-2* [online], http://operby.com/minskaya-tec-2.html [доступ: 8.01.2017].

*Мінск незнаёмы. 1920–1940*, аўтар-укл. І. Куркоў, Мінск 2002.

*Нямецкія вайсковыя могілкі 1941–1944 гг. пад Мінскам* [online], https://be.wikipedia.org/wiki/Нямецкія_вайсковыя_могілкі_1941-1944_гг._пад_Мінскам [доступ: 7.02.2017].

Пазьняк З., *Гутаркі з Антонам Шукелойцем*, Warszawa, Vilnius 2003.

*Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Мінска. У 4 кн. Кн. 3*, Мінск 2004.

*Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Мінска. У 4 кн. Кн. 4*, Мінск 2005.

*Пераканайцеся*, «Беларуская Газэта» 1942, 6 верасьня.

Ростовцев П., *Использование немецких аэрофотоснимков Минска в изучении характера разрушений города в 1941–1944 гг.* [у:] *Мінск і мінчане…*, Мінск 2012.

*Святло Чырвонага касцёла. Да стагоддзя Касцёла Святога Сымона і Святой Алены*, укл. У. Завальнюк, А. Сакалоўская, Мінск 2015.

Станюта А., *Стэфанія*, Мінск 1994.

Степанова Т., *Один из минских трудяг-старожилов*, «Минский курьер» 2002, № 29.

Туронак Ю., *Мадэрная гісторыя Беларусі*, Vilnius 2006.

Ул. К., *Мастацтва народу (на адкрыцьці 2-ое мастацкае выстаўкі ў Менску)*, «Беларуская Газэта» 1942, 15 кастрычніка.

Усачев О., *Лагерь военнопленных в Пушкинских казармах, часть 1* [online], http://minsk-old-new.com/minsk-3309-ru.htm [доступ: 15.01.2017].

Усачев О., *Явные и тайные резиденции Кубе* [online], http://minsk-old-new.com/life/war1941-1945/yavnye-i-tajnye-rezidencii-kube [доступ: 22.01.2018].

*Усебеларуская выстаўка выяўленчага мастацтва «Ленін і Сталін арганізатары БССР». Жывапіс. Графіка. Скульптура. Архітэктура*, Мінск 1940.

*Хлебозавод «Автомат»* [online], http://www.minskhleb.com/enterprise/factories/avtomat/ [доступ: 14.01.2017].

*Церкви и приходы Минска. История и современность*, Минск 1996.

*Цудоўны палац*, «Іскры Ільіча» 1936, № 9.

Шаровар Д., *Привидение из 1942 года*, «Советская Белоруссия» 2003, 8 апреля.

Шостак Г., *Театр оперы и балета «…зерно будущего и плевелы настоящего»* [online], https://ais.by/story/2292 [доступ: 15.02.2017] .

Шукелойць А., *Менск пад немцамі*, «Наша ніва» 1992, № 9.

Шэйкін Г., *Храм-помнік на Вайсковых могілках у Мінску*, «Беларускі гістарычны часопіс» 1998, № 2.

**Minsk, June 23, 1941 – July 23, 1944**

The article attempts to collect some materials about several buildings in Minsk that survive to this day and are associated with the events on June 23, 1941 – July 23, 1944: between the first and the last German bombing attack on the city, which set up a chronological framework for the period when the city was directly affected by the events of the World War II. The buildings that survive to the present day are listed alphabetically according to current addresses. The history of architectural objects before 1941 and after 1944 is reflected selectively, if it is essential for clarification of their fate under the German occupation.

Keywords: Minsk, architekture, World War II, occupation



Кальварыйскія могілкі. Пахаванне В. Іваноўскага. Снежань 1943 г.



Былы Лошыцкі аэрадром (Minsk-Süd)




Карла Маркса вул., 38. Ліпень 1944 г. Фота А. Дзітлава



Савецкая вул., 18. 1941 г.



Кірыла і Мяфодзія вул., 3 (у цэнтры)



Незалежнасці пр., 66 і нямецкія вайсковыя могілкі




Свярдлова вул., 2



Энгельса вул., 7. Чэрвень 1943 г.